НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ

УДК 283/289+281.9](476)(091)

ГАРБАЦКІ Андрэй Аляксандравіч

# СТАРААБРАДНІЦТВА НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVII – ПАЧАТКУ XX стст.

07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара
гістарычных навук

Мінск - 1999

Работа выканана ў аддзеле гісторыі Беларусі XIII-XVIII стст.
Інстытута гісторыі НАН Беларусі

Афіцыйныя апаненты:
доктар гістарычных навук, праф. Грыцкевіч А.П.
доктар гістарычных навук, праф. Корзун М.С.
доктар гістарычных навук, праф. Навіцкі У.І.

Апаніруючая арганізацыя – Гродзенскі дзяржаўны універсітэт

Абарона адбудзецца “03” снежня 1999 г. у 16.00 гадзін на паседжанні савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (220072, г.Мінск. вул. Ф.Скарыны, 1; тэл. 284-18-39)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа НАН Беларусі
Аўтарэферат разасланы “21” кастрычніка 1999 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат гістарычных навук В.В. Грыгор’ева



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЫСЕРТАЦЫІ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Вывучэнне стараабраднiцтва без разгляду сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем як у Расіі, так і ў суседніх дзяржавах, уяўляецца малаэфектыўным. У адносінах да стараабраднiцтва назіраем неаднастайнасць, якая залежыць у першую чаргу ад адрозненняў у сацыяльным складзе грамадства, ад розная ступені дагматычнага і арганізацыйнага акасцянення стараабрадніцкіх сагласаў і толкаў, ад зменлівага ўрадавага курсу ў адносінах да “расколу”.

Антыфеадальны сацыяльна-палітычны пратэст народных мас у традыцыйнай сярэдневяковай форме рэлігійнага руху быў магчымы ў канцы XVII ст. і ў XVIII ст. таму, што асноўны прынцып саюза царквы і феадальнай дзяржавы не быў парушаны асвечаным абсалютызмам. Процірасколыніцкая практыка асвечаных цароў XVIII ст. напоўнена мноствам прыкладаў самага грубага паліцэйскага ўмяшання ў справы веры дзеля абароны пануючай царквы. У пачатку 20-х гадоў XVIII ст. былі канчаткова сфармуляваныя інквізіцыйныя законы, якія часткова яшчэ абапіраліся на Улажэнне 1649 г., згодна з якім уся карная магутнасць дзяржавы магла быць выкарыстана для аховы рэлігійна-ідэалагічнай манаполіі пануючай царквы.

Інквізіцыйныя законы, прынятыя ў пачатку 20-х гадоў XVIII ст. былі дапоўненыя і расшыраныя ў першай палавіне XIX ст. з улікам новых сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў.

Аналіз канкрэтных падзей на беларускіх землях у канцы XVII – пачатку XX ст.ст. – гэта важная даследчая праблематыка, без вывучэння якой не могуць быць поўнымі нашы ўяўленні аб рускім стараабрадніцтве.

Гісторыя стараабрадніцтва на беларускіх землях набыла асаблівую актуальнасць у пачатку 90-х гадоў XX ст., калі больш шырока пачалі вывучацца канфесіі, якія існавалі і існуюць на Беларусі. На сённяшні дзень пытанне аб гісторыі стараабрадніцтва на беларускіх землях з’яўляецца важным як для беларускай гістарычнай навукі, так і для расійскай гісторыі. Рускія стараабраднікі, якія ў канцы XVII ст. вымушаны былі перасяліцца на беларускія землі, здолелі за кароткі тэрмін адрадзіць сваё духоўнае жыццё, наладзіць гаспадарку; немалаважным з’яўляецца і тое, што яны знайшлі паразуменне з мясцовым насельніцтвам і з мясцовымі ўладамі. Таму так важна вывучэнне асаблівасцей жыцця стараабраднікаў на беларускіх землях, яно дае магчымасць пашырыць нашы веды аб славянскай культуры, зразумець, чаму беларуская зямля на доўгія гады стала месцам жыхарства для пераселеных з Расіі абаронцаў старога абраду. Даследаванне гісторыі стараабрадніцтва на беларускіх землях дае станоўчыя прыклады суіснавання славянскіх народаў, вызначае ў гэтых адносінах ролю беларускага народа, яго характар і менталітэт.

**Сувязь працы з навуковымі праграмамі і тэмамі.** На кафедры культуралогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта аўтар дадзенай працы ў 1992

г. прымаў удзел у распрацоўцы метадычнага дапаможніка і планаў практычных заняткаў па курсу “Гісторыя і тэорыя рэлігіі і атэізму”.

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта работы заключаецца ў тым, каб паказаць прычыны перасялення рускіх стараабраднікаў на землі Рэчы Паспалітай, а таксама спецыфіку сацыяльнай арыентацыі, сацыяльна-эканамічных, культурна-духоўных адносін і маральных установак стараабрадніцкіх сагласаў і толкаў на беларускіх землях. У сувязі з гэтым вызначаны задачы:

- паказаць гісторыю ўзнікнення найбольш уплывовых сагласаў і толкаў у рускім стараабрадніцтве, працяг іх узнікнення на беларускіх землях;
- разгледзець асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця стараабраднікаў на беларускіх землях;
- раскрыць спецыфіку гаспадарчых заняткаў і промыслаў стараабраднікаў на Беларусі, асаблівасці іх побыту;
- паказаць умяшанне расійскіх улад ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай у час “выганак” 1735 і 1764 гг. і наступствы гэтых выганк;
- паказаць асаблівасці культурна-духоўнага жыцця абаронцаў старога абраду на беларускіх землях;
- прааналізаваць палітыку Расійскай імперыі ў дачыненні да стараабраднікаў у беларуска-літоўскіх губернях у канцы ХУІІ – пачатку ХХ ст.ст.

**Аб’ект і прадмет даследавання.** Аб’ектам даследавання з’яўляюцца архіўныя дакументы і этнаграфічныя матэрыялы, якія датычаць жыцця стараабраднікаў на беларускіх землях. Гэтыя дакументы, апублікаваныя і не апублікаваныя, складаюць асноўную базу навуковай працы, усе матэрыялы якой можна падзяліць на дзве групы: дакументы-арыгіналы і копіі, што захаваліся ў архівах.

Прадметам даследавання з’яўляецца важны гістарычны працэс: перасяленне ў межы Рэчы Паспалітай, а канкрэтна на беларускія землі, вялікай колькасці рускіх стараабраднікаў і жыццё іх на Беларусі.

Выбар храналагічных рамак навуковай працы абумоўлены адсутнасцю комплекснага даследавання гэтага перыяду гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі. Для выяўлення асаблівасцей узнікнення рускага стараабрадніцтва і перасялення абаронцаў старога абраду на беларускія землі даследаванне ў некаторых выпадках выходзіць за вызначаныя тэмай храналагічныя рамкі.

**Тэорыя праблемы і метады праведзенага даследавання.** Тэорыю праблемы мы бачым у тым, што ў сённяшнім цывілізаваным свеце нельга не прызнаць значэнне рэлігіі ў жыцці народаў. Гэта асабліва важна ў цяперашні час, калі на Зямлі не спыняюцца войны і ваююць паміж сабой не толькі дзяржавы, але і прыхільнікі розных рэлігій. У сувязі з гэтым вучоныя даследуюць як станоўчыя, так і адмоўныя прыклады ўплыву рэлігіі на суіснаванне народаў і канфесій. Наша дысертацыя прысвечана даследаванню гісторыі рускага стараабрадніцтва на беларускіх землях, гісторыі створанай на



гэтых землях стараабрадніцкай культуры і эканомікі, гісторыі мірнага суіснавання стараабраднікаў з мясцовым насельніцтвам. Асноўным метадам праведзенага даследавання з’яўляецца гісторыка-абагульняльны метад: аналіз і абагульненне архіўных матэрыялаў, стараабрадніцкіх рукапісаў і гістарычных даследаванняў па нашай тэме. Выкарыстоўваліся таксама гісторыка-сістэмны, гісторыка-генетычны і гісторыка-тыпалагічны метады.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Шляхам аналізу гістарыяграфіі ўстаноўлена, што знаходжанне стараабраднікаў на беларускіх землях вывучана фрагментарна і недастаткова. Навізна даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню гісторыя стараабрадніцтва на Беларусі з канца ХУІІ ст. да пачатку ХХ ст. разглядаецца як адзінае цэлае. Гэта дазволіла не толькі выявіць асноўныя прычыны перасялення стараабраднікаў на беларускія землі, але і паказаць асаблівасці іх пражывання на Беларусі, а таксама сцвярджаць, што стараабрадніцтва стала тут самастойнай канфесіяй.

Дастаткова шырокія храналагічныя рамкі даследавання дазволілі прасачыць палітыку Расіі і Рэчы Паспалітай у адносінах да расійскіх стараабраднікаў.

Паралельна ў дысертацыі ўпершыню вырашаны і некаторыя іншыя праблемы, а менавіта: перыядызацыя гісторыі ўсяго стараабрадніцтва і гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі з канца ХУІІ ст. і да пачатку ХХ ст.; абгрунтаванне ўжывання ў працы слоў “стараабраднік” і “старавер”; на падставе функцыянальных прымет дадзена тыпалагічная характарыстыка паасобных дакументаў аб стараабрадніцтве, якія былі выдадзены расійскім урадам. Абгрунтавана і шырока даецца ў дысертацыі аналіз адносін рускіх стараабраднікаў і мясцовага насельніцтва; сабраны аўтарам матэрыял аб побыце, абрадах і звычаях стараабраднікаў дае падставы гаварыць аб настойлівай неабходнасці развіцця ў беларускай гістарычнай навуцы этнаграфічнага даследавання рускіх перасяленцаў-стараабраднікаў; удакладнены падлік колькасці стараабраднікаў, якія пражывалі на Беларусі ў вызначаны перыяд.

Дадзенае даследаванне з’яўляецца своеасаблівым этапам у вывучэнні гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі. Атрыманыя высновы дазваляюць вызначыць задачы, шляхі і метады далейшых даследаванняў гэтай праблемы.

**Практычнае значэнне атрыманых вынікаў** падаецца ў двух аспектах – навуковым і выхаваўча-дыдактычным. Дысертацыя з’яўляецца першым комплексным даследаваннем гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі. Зробленыя аўтарам высновы з’яўляюцца ўкладам у развіццё гістарыяграфіі стараабрадніцтва. Высновы аб асаблівасцях пражывання стараабраднікаў на беларускіх землях маюць значэнне для вучэбных праграм як па гісторыі Беларусі, так і па гісторыі Расіі. Матэрыял дадзенай дысертацыі выкарыстоўваецца ў навучальным працэсе ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце, а таксама ў дзейнасці Цэнтральнага Савета (Старажытнаправаслаўнай) Паморскай Царквы ў Рэспубліцы Беларусь, з

кіраўніцтвам якога аўтар падтрымлівае сувязі. Падрыхтаваную на матэрыяле дысертацыі манаграфію можна выкарыстаць як вучэбны дапаможнік па адпаведных курсах лекцый у школах, сярэдніх навучальных установах і ВНУ як у Беларусі, так і за яе межамі.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Шырокі рух у Маскоўскай дзяржаве за стары абрад не быў аднародным. Ідэі "старой веры", чысціні старажытнай набожнасці вызнавалі як прыгонныя сяляне і бяспраўныя гараджане, так і купцы і баяры. Абаронцы старога абраду з'явіліся ва ўсіх кутках рускай зямлі, а некаторыя перасяліліся на беларускія землі ў тагачаснай Рэчы Паспалітай да афіцыйнага расколу РПЦ.
2. Стараабраднікі хутка ўключаліся ў сістэму эканамічных адносін у Рэчы Паспалітай, займаючыся адначасова ўмацаваннем эканамічнай базы стараабрадніцкіх абшчын і фарміраваннем рэлігійна-ідэалагічных стымулаў.
3. Стараабраднікі здолелі стварыць на беларускіх землях свой быт, свой спосаб жыцця, які адрозніваўся ад быту мясцовага насельніцтва, быў станоўчы іварты перайманне.
4. На беларускіх землях стараабраднікі здолелі за кароткі тэрмін адрадзіць сваё культурна-духоўнае жыццё, улічыўшы мясцовыя асаблівасці.
5. Значныя эканамічныя страты былі прычыненыя Рэчы Паспалітай у выніку выгнанняў стараабраднікаў з беларускіх зямель.
6 Асаблівасцю пражывання стараабраднікаў на беларускіх землях было адкрытае спавяданне сваёй веры, і іх мірнае суіснаванне з мясцовым насельніцтвам.
7 Стараабрадніцтва на Беларусі стала фактычна самастойнай канфесіяй.
8 Погляды стараабраднікаў у палітычным плане нельга назваць стабільнымі. Яны заўсёды памяталі, што іх радзіма Расія, і не парывалі кроўных сувязяў з ёю, захоўвалі рускую мову, у час вайны з Напалеонам у 1812 г. актыўна змагаліся на баку рускіх войскаў, а падчас паўстання 1863 года зноў сталі на бок рускіх войскаў, якія падаўлялі паўстанне на беларускіх землях.
9. Палітыка Расійскай імперыі ў дачыненні да стараабраднікаў, якія пражывалі на беларускіх землях, мела сваю спецыфіку: а) да падзелу Рэчы Паспалітай Расійскія ўлады рабілі ўсё, каб не дапусціць аб'яднання і згуртавання стараабраднікаў на беларускіх землях, баючыся стварэння стараабрадніцкай уплывовай сілы супраць рускай дзяржавы; б) пасля падзелу Рэчы Паспалітай расійскім уладам было выгадна знаходжанне стараабраднікаў у беларуска-літоўскіх губернях, як сваёй надзейнай апоры - таму жорсткая палітыка, якая была характэрная ў дачыненні да ўсяго расійскага стараабрадніцтва, атрымала больш паблажлівы характар у дачыненні да стараабраднікаў на беларускіх землях.



**Асабісты ўклад суіскальніка.** Аўтар з 1992 г. праводзіў даследаванні ў беларускіх, расійскіх і літоўскіх архівах. Адначасова праводзіў этнаграфічныя экспедыцыі ў месцах, дзе і цяпер жывуць стараабраднікі. Вынікі даследаванняў апублікаваны ў манаграфіі і 22 артыкулах. Змешчаная ў манаграфіі перыядызацыя гісторыі стараабрадніцтва аўтарам распрацавана самастойна.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання дакладваліся аўтарам і атрымалі станоўчую ацэнку на наступных навуковых канферэнцыях:

1. Третьи общественно-политические чтения, посвященные памяти К. Лыщинского. (Брест, май 1993 г.). Тэма даклада: "Из истории старообрядчества".
2. Рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя "Праблемы чалавека ў сучасных філасофскіх і гуманітарных ведах". (Брэст, 1993). Тэма даклада: "Некаторыя асаблівасці веравучэння і культу стараверaў".
3. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Дыялектыка свядомасці сучаснай моладзі". (Брэст, 25 – 26 кастрычніка 1994 г.). Тэма даклада: "Правіла жыцця ў міру для моладзі стараверaў".
4. Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Рэгіянальныя асаблівасці беларуска-пінскага палесся ў мове, фальклоры і літаратуры". (Брэст, 9 – 10 лістапада 1994 г.). Тэма даклада: "Звычай хаджэння па сонцу стараверaў".
5. ІУ чытанні, прысвечаныя К. Лышчынскаму. (Брэст, 23 мая 1995 г.). Тэма даклада: "Аб любві і дзесяці запаведзях Божых у стараверaў".
6. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества". (Минск, 9 – 10 февраля 1995 г.). Тэма даклада: "Некаторыя асаблівасці староверчаскай абшчыны і сучаснасць".
7. Навукова-практычная канферэнцыя "Брестчина от прошлого к будущему: Наука. Политика. Бизнес. Образование". (Брест, 12 – 13 декабря 1995 г.). Тэма даклада: "Староверства на Беларусі ў першай палове XIX ст.".
8. Міжнародная навуковая канферэнцыя "Брэсцкай царкоўнай уніі – 400". (Брэст, 8 – 9 кастрычніка 1996 г.). Тэма даклада: "Перыядычны друк у стараверaў".
9. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі". (Брэст, 23 – 24 кастрычніка 1998 г.). Тэма даклада: "Единоверие и судьба русского этноса на Беларуси".
10. Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Мировоззрение и наука на рубеже третьего тысячилетия" (Брэст, 17 – 18 лістапада 1998 г.). Тэма даклада: "Природа свадебных обрядов старообрядцев на Белоруси в конце XIX – начале XX вв.".

**Апублікаванасць вынікаў даследавання.** Вынікі даследавання выкладзены ў спецыяльнай манаграфіі "Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы

XVII – пачатку XX стст.” (Брэст: 1999) і 22 артыкулах (з іх 2 у зборніках, 9 у часопісах, у тым ліку 9 у рэцэнзаваных).

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі, 5 глаў, заключэння. Тэкст дысертацыі займае 227 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц складае 380 назваў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Дысертацыя складаецца з уводзін, пяці глаў і заключэння.

Ва Уводзінах агаворваюцца храналагічныя рамкі даследавання, удакладняецца ўжыванне некаторых тэрмінаў. Храналагічныя рамкі даследавання прыняты: канец XVII – пачатак XX ст.ст. Гэта перыяд з пачатку расколу РПЦ і з'яўлення старaабраднікаў на беларускіх землях і да пачатку прызнання расійскай дзяржавай стараабрадніцтва. Аналіз гістарычнага развіцця стараабрадніцкага руху як на расійскіх, так і на беларускіх землях у канцы XVII – пачатку XX ст.ст. дазволіў выдзеліць восем этапаў.

У працэсе напісання дысертацыі паўстала пытанне адносна выбару тэрмінаў паняццяў *староверство* і *старообрядчество*, *старовер* і *старообрядец* і перакладу іх на беларускую мову. У дысертацыі ўжываюцца тэрміны *стараабраднік* і *стараабрадніцтва* і даецца гэтаму абгрунтаванне. У даследаванні тэрмінам *саглас* азначаецца буйны падзел стараабрадніцтва, тэрмін *толк* азначае больш дробны чым саглас падзел.

**Першую главу** дысертацыі складае крыніцазнаўчы і гістарыяграфічны аналіз. У першым раздзеле першай главы аналізуюцца крыніцы даследавання. Пры напісанні працы выкарыстаныя два галоўныя віды крыніц: пісьмовыя і этнаграфічныя. Акрамя таго, аўтар звяртаўся да картаграфічных матэрыялаў, пададзеных у спецыяльных публікацыях.

Большая частка інфармацыі аб пражыванні стараабраднікаў на беларускіх землях знойдзена ў архівах: Нацыянальны гістарычны архіў Рэсрублікі Беларусь (НГАРБ), Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў (РДАСА), Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (РДГА), Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Усе астатнія крыніцы толькі дапаўняюць архіўны матэрыял.

Самы каштоўны матэрыял знойдзены ў НГАРБ і ЛДГА. У беларускім і літоўскім архівах знаходзіцца багаты і цікавы матэрыял аб занятках стараабраднікаў, землекарыстанні, купецкіх справах. У ЛДГА, напрыклад, намі знойдзены матэрыял, з якога відаць, чым займаліся стараабраднікі ў Відзах (ф.725), (матэрыял даецца ўпершыню), у Гомельскім старостве (ДА 3774, 3787), (матэрыял даецца ўпершыню). У НГАРБ знойдзены штогадовыя ведамасці па паветах і губернях аб колькасці “раскольнікаў” і “раскольніцкіх” храмах (ф.242,295,1416,1430,2014,2001).

Мінскае губернскае “присутствие” патрабавала ад павятовых прадстаўнікоў, якія складалі спісы, указваць род заняткаў усіх мяшчан-



стараабраднікаў (НГАРБ, ф.1595). Сярод стараабраднікаў на беларускіх землях было шмат купцоў, у большасці 3-й гільдыі. Аб гэтым сведчаць матэрыялы архіваў: (НГАРБ, ф.1430, ф.2001, ф.2014; РДАСА, ф.16; ЛДГА, ДА 4070; ф.752; РДГА, ф.1405). (Матэрыял аб купцах-стараабрадніках на беларускіх землях даецца ўпершыню).

У дакументах змешчана інфармацыя аб тым, чым гандлявалі стараабраднікі, якой маёмасцю валодалі, якія ў іх былі цяжкасці.

Адметнай і багатай была культура стараабраднікаў. Імі былі пабудаваны і багата аздоблены храмы і манастыры. Архівы расказваюць аб унутраным выглядзе храмаў. Апісаннем займаліся прадстаўнікі праваслаўнай царквы, таму яно носіць прафесійны характар. У гэтым плане цікавымі з'яўляюцца матэрыялы з (НГАРБ, ф.1430, ф.2001, ф.1297, ф.797; РДГА, ф.815, ф.381). (Матэрыял фонду 2001, воп.1, сп.259 даецца ўпершыню).

Цікавасць для гісторыкаў уяўляе разглядаемая ў дысертацыі такая з'ява, як аднаверства. Архіўныя матэрыялы даюць даведкі, рапарты і данясенні прадстаўнікоў Рускай праваслаўнай царквы аб узнікненні і станаўленні аднаверства. Шмат інфармацыі аб аднаверстве знаходзім у дакументах Свяшчэннага Сінода. Крыніцы такога роду вызначаюцца падрабязнай характарыстыкай таго або іншага сагласа ці толка і адносінамі ўсіх структур РПЦ да стараабраднікаў, якія пражывалі ў канкрэтным павеце. Матэрыялы па гэтай праблеме знаходзяцца ў наступных фондах (НГАРБ, ф.1430, ф.295, ф.1297, ф.2014).

Да неапублікаваных адносяцца дакументы аб матэрыяльных стратах, прычыненых староствам Рэчы Паспалітай “выганкамі” стараабраднікаў. Такімі дакументамі з'яўляюцца “инвентарь” (вопіс маёмасці) Гомельскага старoства Рэчыцкага павета, 1738 г. (ЛДГА, ДА 3774) і люстрацыя (рапарт аб праведзенай інспекцыі) Гомельскага староства Рэчыцкага павета, 1765 г. (ЛДГА, ДА 3787).

У дысертацыі вялікая ўвага ўдзелена вывучэнню ўказаў рускіх цароў, пастаноў расійскага Сената і афіцыйных дакументаў Свяшчэннага Сінода, якія датычаць стараабрадніцтва.

Значную цікавасць уяўляюць дзелавая перапіска і выказванні дзяржаўных і царкоўных дзеячоў. Гэта перш за ўсё перапіска адносна выканання ўказаў аб закрыцці стараабрадніцкіх культавых будынкаў і аб вяртанні рускіх стараабраднікаў з-за мяжы, якую вялі мясцовыя губернскія ўстановы з уезднымі і цэнтральнымі ўстановамі – Сенатам, Кабінетам Міністраў, Ваеннай калегіяй, Калегіяй замежных спраў, Свяшчэнным Сінодам. Не меншую цікавасць уяўляе перапіска, якую вялі цэнтральныя ўстановы паміж сабой, перапіска паміж царамі і военачальнікамі адносна стараабрадніцтва. Да такога віду архіўных матэрыялаў неабходна аднесці наступныя дакументы: 1. Данясенне Сената ў 1741 г. імператрыцы “О разбойничьих нападениях и грабительствах, производимых из-за границы Польской в Малороссийских стародубском и черниговском полках”, у якім увага звярталася на ваяўнічасць расійскіх збеглых людзей (РДАСА, ф.12, воп.1, сп.95.); 2. Пісьмо Кацярыны II

да генерал-фельдмаршала графа Салтыкова перад аб'явай маніфеста ад 19 ліпеня 1762 г. У гэтым пісьме царыца абгрунтоўвала неабходнасць выгнання стараабраднікаў з Рэчы Паспалітай (РДАСА, ф.248, воп.42, сп.3672.); 3. Данясенні князю Пацёмкіну-Таўрыцкаму "Аб сваявольствах палякаў", Аб рускіх стараабрадніках у Польшчы, тамашніх замяшаннях і інш. (РДАСА, ф.12, воп.1, сп.118.); 4. Перапіска Ваеннай калегіі са Свяшчэнным Сінодам. Ваенная калегія перадавала звесткі аб выселеных з Рэчы Паспалітай стараабрадніках (РДГА, ф.796, воп.46, сп.55.).

Да неапублікаваных архіўных матэрыялаў адносяцца наступныя дакументы: выступленне іераманаха Феафана Леонцьевіча ў 1762 г. у Свяшчэнным Сінодзе "О пользе от защиты Россиею православных, живущих в Польше" (РДАСА, ф.12, воп.1, сп.111.); пісьмо Кацярыны II графу генерал-паручыку Мельгунову аб неабходнасці ўплыву на польскую шляхту, каб апошняя перадавала рускіх збеглых. Кацярына II прапанавала спальваць падазроныя будынкі "на польскім боку без разбору" (РДАСА, ф.12, воп.1, сп.118.); рапарт Сената Кацярыне II у жніўні 1763 г., у якім ішла гаворка аб адносінах польскіх памешчыкаў да стараабраднікаў (РДАСА, ф.163, воп.1, сп.20.); рапарт епіскапа Астраханскага Мяфодзія Свяшчэннаму Сіноду ў 1765 г. "О выходцах из-за границы и поселившихся в Астраханской епархии раскольниках". Аўтар рапарту падрабязна апісвае заняткі перасяленцаў і выказвае заклапочанасць з прычыны ўплыву "раскольнікаў" на праваслаўных (РДГА, ф.796, воп.46, сп.308.); данясенне епіскапа Уладзімірскага ў 1784 г. Свяшчэннаму Сіноду "О вышедших из-за границы раскольницких монахах и монахинях". У данясенні ўказвалася месца нараджэння стараабраднікаў, род заняткаў, дзе былі за мяжой і чым займаліся (РДГА, ф.796, воп.64, сп.347.); рапарт мітрапаліта Новарасійскага і Дняпроўскага Гаўрыіла Свяшчэннаму Сіноду ад 4 жніўня 1798 г., у якім мітрапаліт паведамляў аб становішчы ў Чонскім і Лаўрэнцьеўскім стараабрадніцкіх манастырах, што знаходзіліся на беларускіх землях (РДГА, ф.1341, воп.303, сп.44.); пісьмо цара Мікалая I ад 17 красавіка 1847 г. Ф. Паскевічу "О Могилевских раскольниках" (РДГА, ф.1018, воп.5, сп.305.); рапарт архіепіскапа Мінскага і Бабруйскага Міхаіла ад 7 жніўня 1854 г. Свяшчэннаму Сіноду "О раскольниках в Минской губернии и мерах борьбы с ними" (РДГА, ф.796, воп.135, сп.1287.); пісьмо міністра ўнутраных спраў ад 21 красавіка 1855 г. обер-пракурору Свяшчэннага Сінода аб мерах барацьбы з "раскольнікамі" ў Магілёўскай губерні (РДГА, ф.796, воп.136, сп.463.); перапіска паміж магілёўскім губернатарам, Камітэтам міністраў і Свяшчэнным Сінодам у 1862 г. "О закрытии Пахомъева и Никольского монастырей старообрядцев в Могилевской губернии", "О уничтожении Белицкой раскольнической часовни" (РДГА, ф.1263, воп.1, сп.2970.).

Рукапісная стараабрадніцкая літаратура – гэта ўнікальная з'ява старажытнарускай культуры, з'ява, якая не мае аналогіі ні да ўзнікнення стараабрадніцтва, ні ў наступны перыяд рускай гісторыі. Гэта непаўторнасць заключаецца ў асаблівых умовах, якія складваліся для стараабраднікаў як на



беларускіх, так і на іншых землях, дзе ім давялося жыць. У сваіх рукапісах пісьменнікі-стараабраднікі паказвалі ўмовы свайго жыцця, свой побыт, погляды на пытанні веры і абрадаў, вялі палеміку і перапіску з прадстаўнікамі іншых сагласаў і толкаў. Асаблівую цікавасць уяўляе палеміка і перапіска папоўцаў з беспапоўцамі.

У Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт Пецярбургу і ў Літоўскай нацыянальнай бібліятэцы імя Марцінаса Мажвідзіса намі вывучаны стараабрадніцкія рукапісы, сярод якіх ёсць і напісаныя стараабраднікамі, што жылі на беларускіх землях.

Значная частка інфармацыі здабыта гісторыкамі з апавядальных крыніц. У сваёй дысертацыі мы выкарысталі адну з такіх крыніц – "Дегуцкий летописец", які быў знойдзены ў 1973 г. у час археаграфічнай экспедыцыі Пушкінскага Дома ў Прыбалтыку, а больш канкрэтна ў Зарасайскім раёне. "Дегуцкий летописец" захоўваўся ў доме І.Ф. Паўлава, галаўшчыка Зарасайскай стараабрадніцкай абшчыны. У летапісе падаюцца падзеі з 1652 г. па 1850 г. у выглядзе розных па аб'ёму гадавых запісаў, прычым ніводны год не прапушчаны. Падзеі ў летапісе адносяцца як да гісторыі Расіі, так і да гісторыі Беларусі.

Намі былі арганізаваны і праведзены экспедыцыі ў раёны, дзе жылі і цяпер жывуць стараабраднікі. Гэта Мінская вобласць (Барысаўскі і Валожынскі раёны), Гомельская вобласць (Гомельскі, Веткаўскі і Добрушскі раёны), Віцебская вобласць (Браслаўскі і Шаркоўшчынскі раёны). У час экспедыцый даследаваліся абрадавая практыка, побыт і культура стараабраднікаў, іх вытворчая дзейнасць: земляробства, жывёлагадоўля, рамесніцтва і промыслы. Зроблены аўдыязапісы ўспамінаў старажылаў па ўсіх накірунках даследавання, асабліва аб абрадах у канцы XIX – першай палавіне XX ст.ст. Частка сабраных матэрыялаў выкарыстана ў дысертацыі.

**Другі раздзел** першай главы складае аналіз гістарыяграфіі.

У гэтым раздзеле ўвага канцэнтруецца на спецыяльных даследаваннях па гісторыі стараабрадніцтва, апублікаваных паасобна або ў складзе абагульненых прац. Аўтар не ставіў задачу апісаць ці хаця б пералічыць усе працы, у якіх упамінаецца аб стараабрадніцтве, а імкнуўся прааналізаваць найбольш значныя. Так, напрыклад, у стараабрадніцкіх радаслоўях і пісьмах знаходзім першыя звесткі аб перасяленні стараабраднікаў на беларускія землі і аб пражыванні на іх.

Гістарыяграфічны агляд друкаваных прац аб стараабрадніцтве аўтар дысертацыі робіць па трох перыядах. Першы: XVIII ст. – першая палавіна XIX ст., другі: другая палавіна XIX ст. – 1917 г., трэці: 1917 г. – канец XX ст.

**XVIII ст. – першая палавіна XIX ст.** Гэты перыяд не быў багаты на працы па стараабрадніцтву. Найбольш значныя даследаванні выйшлі ў канцы XVIII ст. Аўтарамі іх з'яўляюцца А.І. Жураўлёў і Піцірым (епіскап). У сваёй кнізе "Пращица против вопросов раскольнических", Піцірым вядзе дыялог са стараабрадніцкім дыяканам Аляксандрам па наступных пытаннях: што ёсць

вера; аб падданні веры; якое ёсць падданне веры; што ёсць дагмат; што ёсць дагмат веры; ці адзінае дагмат веры і падданне веры; аб царкоўным падданні; што ёсць царква; што ёсць адзіная святая саборная і апостальская царква; што ёсць царкоўная аснова; вера, хрышчэнне і падданне і ўвесь лад царкоўны і інш.

Ацэнку стараабрадніцтву, блізкую да той, што дае ў працы Піцырым, выказвае пратаіерэй А.І. Жураўлёў у кнізе "Полное историческое известие о древних стригольниках, и новых раскольниках, так называемых старообрядцах, о их учении, делах и разногласиях". Прыхільнік афіцыйнай праваслаўнай царквы, ён крытыкуе стараабрадніцтва. Станоўчым з'яўляецца тое, што ў яго кнізе змешчана шмат гістарычнага і фактычнага матэрыялу. Найбольшую цікавасць уяўляюць главы аб беспапоўцах і папоўцах. У главе "О беспоповщине" аўтар падае гісторыю ўзнікнення і вучэння паморцаў, федасееўцаў, філіпонаў, нетаўцаў, адамантаўцаў. Падрабязна апісваецца жыццё стараабраднікаў у Аланецкім і Паморскім краях. Разважаючы аб федасееўцах, А.І. Жураўлёў называе іх "злейшими и дерзостнейшими, каковы едвали кто видел". У гэтай главе паказаны шляхі руху беспапоўцаў на беларускія землі. У главе "О поповщине" А.І. Жураўлёў расказвае пра асаблівасці вучэння і гісторыі Веткаўскай царквы, аб дыяканаўцах, перамазанцах, епіфанеўцах, чарнобыльцах. У гэтай главе змешчаны цікавы матэрыял аб гісторыі стараабраднікаў-папоўцаў на беларускіх землях. "Ветку мы видим, - піша А.І. Жураўлёў, - прелестницей суеверов. Сеть ее заблуждений привлекла из России всякое число всякого звания беглецов. Она гордится новой Покровской церковью, которую освещал чернец Феодосий, а при ней собралась монашествующих обитель: ветковцев столько населилось, что появилась нужда в бракосочетании и прочих требах". Далей падрабязна пералічаны слабоды на беларускіх землях, дзе жылі стараабраднікі , даецца апісанне "выганак" (1735 г. і 1764 г.) стараабраднікаў з Веткі. У кнізе змешчана шмат этнаграфічнага матэрыялу пра жыццё стараабраднікаў, іх заняткі, адзенне, ежу.

У першай палавіне XIX ст. не было грунтоўных даследаванняў аб стараабрадніцтве. Гэты перыяд характарызуецца жорсткімі адносінамі ўрада да стараабраднікаў, а існаваўшая ў той час сакрэтнасць у адносінах да "раскольнікаў" выявілася і на адсутнасці літаратуры аб іх.

**Другая палавіна XIX ст. – 1917 г.** Адмена прыгоннага права ў Расіі прывяла да таго, што ва ўрадзе пачалі мяняцца адносіны да стараабрадніцтва і метады барацьбы з ім. З'явілася вялікая колькасць афіцыйнай літаратуры, сярод якой важнае месца займала царкоўная літаратура. За многія дзесяцігоддзі Свяшчэнным Сінодам РПЦ быў сабраны вялікі фактычны матэрыял, які выкарыстоўваўся ў царкоўнай літаратуры. Найбольш вядомымі аўтарамі афіцыйнай царкоўнай літаратуры аб стараабрадніцтве ў разглядаемы перыяд былі В. Волкаў, Н. Іваноўскі, Н.Д. Ізвекаў, Ф.В. Ліванаў, В. Лужынскі, Макарый (епіскап), І.Т. Нікіфароўскі, А.С. Пругавін, Д. Растоўскі.

Еп. Макарый у сваёй кнізе "История русского раскола известного под именем старообрядчества" ўдзяляе шмат увагі гістарычным падзеям і датам.



Вось як ён апісвае з'яўленне на беларускіх землях першых беспапоўцаў-федасееўцаў: "Вскоре Феодосий Васильев, которого новгородские раскольники посылали к бежавшим за шведский рубеж, удалился с братом и со всем семейством своим в Польшу, где и сделался основателем особого толка беспоповщинской секты, назвавшагося его именем". Апісвае Макарый і падзеі, звязаныя з паяўленнем на Ветцы папоўцаў, зазначаючы пры гэтым, што з моманту асвячэння тут стараабрадніцкай царквы ў імя Пакрова Прасвятой Багародзіцы (1695 г.): "… начинается новая эпоха в истории Ветки и в истории всей поповщины. Ветка стала быстро возвышаться и сделалась какбы главою поповщины".

У асобную групу даследчыкаў, якія прадстаўлялі пункт гледжання афіцыйнай царкоўнай літаратуры, мы выдзяляем В. Волкава, Н.Д. Ізвекава, В. Лужынскага і І.Т. Нікіфароўскага. Гэта звязана з тым, што названыя даследчыкі (акрамя І.Т. Нікіфароўскага) былі свяшчэннікамі РПЦ і ў сваіх працах закраналі асаблівасці пражывання стараабраднікаў на беларускіх землях.

В. Волкаў, будучы протаіерэем, настаяцелем Віцебскага кафедральнага сабора, правёў даследаванне аб "расколе" ў Віцебскай губерні, вынікі якога былі апублікаваны ў часопісах і асобнай працы "Сведения о начале, распространении и разделении раскола и о расколе в Витебской губернии". У кнізе, якой уласцівы яўна місіянерскі характар, В. Волкаў дае пералік стараабрадніцкіх сагласаў у Віцебскай губерні, указвае час і месца іх рассялення.

Дакладных звестак аб часе пасялення стараабраднікаў у Віцебскай губерні Волкаву знайсці не ўдалося, ён выкарыстаў у асноўным успаміны старажылаў. Яго даныя дазваляюць меркаваць, што стараабраднікі, якія жылі ў Віцебскай губерні, былі неаднародныя па свайму паходжанню, рассяленне іх адбывалася не адначасова. Стараабраднікі, якія жылі на захадзе і паўночным захадзе губерні, - гэта патомкі выхадцаў з Пскоўскай і Наўгародскай зямель, а продкі стараабраднікаў, якія жылі на поўдні і ўсходзе губерні, прыйшлі з поўдня, з Веткі.

Варта спыніцца і на працы старшага выкладчыка Віцебскай духоўнай семінарыі І.Т. Нікіфароўскага "На ниве противораскольнической миссии: Сборник старшего преподавателя Витебской духовной семинарии по истории и обличению раскола". Аўтар вядзе палеміку з прафесарам Н. Капцеравым і са стараабраднікамі па наступных пытаннях: аб абаронцах аўстрыйскай іерархіі; аб чытанні восьмага сімвала веры; аб высокапакланяемым імені Хрыста Збавіцеля; ці было ўжо прышэсце ў свет антыхрыста; аб таінствах хрышчэння, мірапамазання, свяшчэнства, прычашчэння, пакаяння.

У сваёй кнізе І.Т. Нікіфароўскі змясціў "Воззвание к Витебским старообрядцам", дзе зазначаў: "С великою о вас скорбию мы видим, что сей веры Христу Спасителю, его словесам и обетованием о Святой Церкви в ваших обществах не обретается. Вы пребываете без иерархии, не имеете и всех спасительных таинств". Далей у адозве стараабраднікам прапанавалася

перайсці ў праваслаўе або аднаверства, каб мець магчымасці задавальняць усе свае духоўныя патрэбы.

Усіх гісторыкаў цікавілі пытанні аб уплыве стараабраднікаў на мясцовае насельніцтва, аб метадах, якімі яны карысталіся ў сваёй агітацыі праваслаўных і вернікаў іншых канфесій. У гэтых адносінах з'яўляюцца цікавымі працы двух аўтараў: Н.Д. Ізвекава – "Исторический очерк состояния Православной церкви в Литовской епархии за время с 1839 по 1899 г." і В. Лужынскага – "Записки Василия Лужинского архиепископа Полоцкого".

Н.Д. Ізвекаў пісаў: "Раскольнические наставники вели свою пропаганду среди всего населения, что их окружало". Далей аўтар паведамляе, што ў Завілейскім павеце Літоўскай епархіі ў 1839 г. перайшло "в раскол 247 лиц православных, с большим препятствием удалось вернуть в православие только 57 человек". Аўтар называе прычыны, якія спрыялі поспеху стараабрадніцкай агітацыі: "1. Зависимость детей от матерей и влияние раскольнических наставников на все старообрядческое население. 2. Отсутствие православных церквей в местах проживания раскольников и вышедших из раскола. 3. Большое количество раскольнических молелень построенных противозаконно. 4. Раскольники, которые живут в Литовской епархии чувствуют себя свободно в отношении открытого исповедания своей веры. 5. Литовское епархиальное начальство мало внимания обращало на раскольников будучи само поглащено борьбой с католицизмом и полонизмом".

Расказваючы пра асаблівасці жыцця стараабраднікаў у Літоўскай епархіі, Н.Д. Ізвекаў адзначае, што стараабраднікі: "… продолжали жить в Витебской и Ковенской губернии так привольно, как нигде, и возбуждали к себе зависть со стороны раскольников, живших в других местностях России и даже в соседнем Прибалтийском крае".

Аб тым, што спрыяла агітацыі стараабраднікаў на беларускіх землях, піша ў сваёй кнізе "Записки В. Лужинского архиепископа Полоцкого" В. Лужынскі. Аўтар звяртае ўвагу на добрыя адносіны рыма-каталіцкіх памешчыкаў да стараабраднікаў: "Успех присоединения раскольников к единоверию поднял общий вой помещиков римско-католиков, которые всякие безчестные вымыслы и клеветы пускали в ход против нас…".

Фарміраванню рэалістычнага пункту гледжання на праблему стараабрадніцтва садзейнічала ў значнай меры кніга вядомага этнографа А. Семянтоўскага "Этнографический обзор Витебской губернии. У ёй, побач з апісаннем побыту карэннага насельніцтва – беларусаў і літоўцаў, аўтар падрабязна паведамляе аб побыце рускіх стараабраднікаў. У прыватнасці аўтар гаворыць аб рассяленні ў паветах стараабраднікаў, дае даныя аб прыналежнасці да таго ці іншага толка або сагласа.

Для рэальнага ўяўлення ўмоў жыцця і быту кожнай этна-групы найбольшую каштоўнасць мае аналітычны і статыстычны матэрыял. Знаходзім яго ў кнізе А.С. Дэмбавецкага "Опыт описания Могилевской губернии", дзе даецца этнаграфічны агляд народнасцей, якія жылі ў губерні, у тым ліку і



рускіх стараабраднікаў. А.С. Дэмбавецкі, як і А. Семянтоўскі, адзначае характэрную асаблівасць стараабраднікаў-папоўцаў у Магілёўскай губерні, а менавіта іх імкненне пасяляцца асобна, замкнута, іх здольнасць ужывацца з мясцовым насельніцтвам: "Во всех поселениях своих в Могилевской губернии старообрядцы не слились с местным белорусским населением, но держатся отдельно, хотя и не враждебно, а живут дружески с коренными жителями, соседями. Вступая в супружество только между своими же старообрядцами и не роднясь с белорусским населением, старообрядцы сохранили великорусский тип…".

Вялікую ўвагу гісторыка-этнаграфічнаму аналізу жыцця і побыту стараабраднікаў на Ветцы ўдзяліў І. Абрамаў у сваёй працы "Старообрядцы на Ветке. Этнографический очерк". Аўтар працаваў на Ветцы па заданні этнаграфічнага аддзела Геаграфічнага таварыства Расіі. Працягваючы лепшыя традыцыі гісторыка-этнаграфічнага даследавання, закладзеныя яго папярэднікамі, І. Абрамаў сканцэнтраваў сваю ўвагу на шляхах перасялення стараабраднікаў на Ветку; апісаў асаблівасці веравучэння стараабрадніцкіх толкаў на Ветцы; стан мястэчка Ветка ў пачатку XX ст.; звычаі стараабраднікаў; іх промыслы.

**1917 г. – канец XX ст.**

У гэты перыяд былі напісаны працы па гісторыі стараабрадніцтва ў рэспубліках былога СССР, у некаторых з іх разглядаліся агульныя праблемы расколу РПЦ і зараджэнне стараабрадніцтва. Асноўная колькасць даследаванняў у гэты час прыпадае на 60-я – 90-я гады XX ст. Да 1960 г. было выдадзена мала прац аб стараабрадніцтве, толькі дзве з іх заслугоўваюць увагі: кніга С.Ф. Платонава "Памятники истории старообрядчества XУII в." і кніга І.Н. Завалокі "История Церкви Христовой".

С.Ф. Платонаў сканцэнтраваў сваю ўвагу на біяграфіях першых лідэраў стараабрадніцтва і аналізе багаслоўскіх твораў.

У 1937 г. выйшла кніга выдатнага стараабрадніцкага прапаведніка і гісторыка І.Н. Завалокі "История Церкви Христовой". Аўтар быў вядомы не толькі латвійскім стараабраднікам, але і ўсёй стараабрадніцкай Царкве як глыбокі знаўца стараабрадніцкай і старажытнарускай культуры. У сваёй кнізе ён у сціслай форме падае гісторыю выпраўлення царкоўных кніг і прычыны расколу РПЦ.

Найбольш плённымі ў плане даследавання сучаснага стараабрадніцтва і яго гісторыі былі 70-я – 90-я гады XX ст. У гэты перыяд выйшлі працы В.Ф. Мілавідава, А.Е. Катунскага, А. Падмазава, В.Г. Карцава, Ю.В. Гагарына, Е. Іванца, П.І. Мельнікава, Д.Л. Мардоўцава, Н.Н. Пакроўскага, А.В. Карташова, Н.Ю. Бубнова, С.А. Зянькоўскага, Н.С. Гур'янавай, А.В. Вазнясенскага. Працы 70-х – 80-х гадоў XX ст. носяць атэістычны характар, а працы 90-х гадоў – культурна-асветніцкі, крыніцазнаўчы.

Пачатак навуковаму даследаванню стараабрадніцтва быў пакладзены ў канцы 50-х – пачатку 60-х гадоў, калі асноўная ўвага пачала ўдзяляцца

канкрэтна-сацыялагічным даследаваннем рэлігій у СССР. Даследаванні стараабраднiцтва рабіліся ў Беларускай, Латвійскай, Эстонскай і іншых савецкіх рэспубліках. На падставе атрыманых матэрыялаў былі апублікаваны працы, прысвечаныя аналізу сучаснага стараабраднiцтва. У іх змешчаны вывады аб працэсах, што адбываліся ў стараабраднiцтве, у некаторых дадзена характарыстыка стану стараабраднiцтва ў тым або іншым рэгіёне. Гэта працы В.Ф. Мілавідава, А. Падмазава, А. Катунскага, В.Г. Карцава і інш.

У 1977 г. з'явілася праца польскага гісторыка Е. Іванца "Z dziejów Staroorzędowców na ziemiach Polskich XУП – XX w.". У ёй аўтар разгледзеў наступныя пытанні: раскол РПЦ і генезіс руху стараабраднікаў; фарміраванне галоўных стараабрадніцкіх толкаў і асаблівасці іх веры; пасяленні стараабраднікаў на землях Рэчы Паспалітай; стараабраднікі ў Беластоцкім ваяводстве; стараабраднікі на Мазурах у Альштынскім ваяводстве; элементы традыцыйнай рэлігійнай культуры і традыцыйнай матэрыяльнай культуры стараабраднікаў.

Гісторыя канфесій як галіна асобых даследаванняў сфарміравалася ў беларускай навуцы ў апошнія дваццаць гадоў. Найбольшая колькасць даследаванняў была зроблена ў галіне вывучэння гісторыі РПЦ і каталіцызму, некаторыя працы прысвечаны вывучэнню пратэстантызму і іншых канфесій.

Першым з беларускіх даследчыкаў, які яшчэ ў 1931 г. звярнуўся да гісторыі РПЦ, быў М.М. Нікольскі. У кнізе "История русской церкви", трэцяе выданне якой выйшла ў 1985 г., ён звяртаецца да прычын расколу РПЦ, аналізуе рэлігійна-сацыяльныя рухі ў другой палавіне XУП ст.; разглядаючы асаблівасці стараабраднiцтва ў XУШ ст., звязвае рост гандлёвага капіталу з дзейнасцю расійскіх пасадніцкіх стараабраднікаў (аўтар паказвае тры накірункі ў стараабраднiцтве: баярскі, пасадскі і сялянскі).

У 1984 г. выйшла кніга М.С. Корзуна "Русская православная церковь на службе эксплуататорских классов X век – 1917 г.". Разглядаючы стараабраднiцтва як своеасаблівы этап у гісторыі РПЦ, аўтар звяртаецца галоўным чынам да пытання сацыяльнай сутнасці царкоўнага расколу.

Заўважым: М.М. Нікольскі і М.С. Корзун у сваіх працах не разглядаюць гісторыю рускага стараабраднiцтва на беларускіх землях, не даюць аналізу адносін паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай у пытаннях аб рускіх стараабрадніках.

Значнае месца ў беларускай гістарыяграфіі займае калектыўная навуковая праца Т.П. Кароткай, К.С. Пракошынай, А.А. Чуднікавай "Старообрядчество в Белоруссии", у якой асноўны матэрыял пададзены ў філасофска-сацыялагічным плане, а гістарычная частка – у агульным. У першай главе разглядаюцца наступныя пытанні: узнікненне расколу, фарміраванне асноўных уяўленняў стараабраднікаў, пашырэнне стараабраднiцтва ў Беларусі, а другая глава – стану сучаснага стараабраднiцтва.

У параграфе "Распространение старообрядчества в Белоруссии" аўтары вызначаюць час засялення стараабраднікамі Веткі, паведамляюць пра асаблівасці веткаўскага сагласа, пра адносіны ўлад Рэчы Паспалітай да



стараабраднікаў. Матэрыял параграфа пададзены ў кароткай форме: займае ўсяго адзінаццаць старонак.

Недахопам названай працы, на наш погляд, з'яўляецца адсутнасць аналізу жыцця стараабраднікаў на землях цяперашніх Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей у канцы ХУП – XIX стст. Першую главу ўзбагаціла б выкарыстанне архіўнага матэрыялу.

У 1998 г. у рэспубліцы з'явілася калектыўная навуковая праца пад агульнай рэдакцыяй У.І. Навіцкага – "Канфесіі на Беларусі (канец ХУШ – XX ст.)". Аўтары гэтай працы, А.М. Філатава і В.В. Грыгор'ева, даюць агульную характарыстыку стараабраднiцтва на Беларусі па губернях у другой палавіне ХУШ ст. – пачатку XX ст. і закранаюць пытанні аб адносінах паміж праваслаўнымі святарамі і стараабраднікамі.

**Другая глава** прысвечана гісторыі стварэння сагласаў і толкаў у папоўстве і беспапоўстве.

Шырокі рух за стары абрад, які ахапіў Маскоўскую дзяржаву, не быў аднародным. Ідэі "старой веры", чысціні старажытнай набожнасці вызнавалі як прыгонныя сяляне і бяспраўныя гараджане, так і купцы і баяры. Яны ў гэтай барацьбе мелі розныя мэты, але імкненні, як правіла, былі аднолькавыя. Стараабрадніцкі рух з самага пачатку стаў набываць сацыяльную афарбоўку, хоць як адкрытая апазіцыя праявіўся найперш сярод нізавога духавенства.

У папоўства выдзелілася найбольш заможная частка стараабраднікаў, якія з прычыны эканамічнага становішча не хацелі карэнных пераўтварэнняў грамадства і імкнуліся да прымірэння з дзяржавай і пануючай царквою. Папоўцы былі, можна сказаць, "царыстамі" аднак прызнаць цара-рэфарматара памазаннікам божым, тым больш кіраўніком царквы, адмаўляліся, спасылаючыся на евангельскую догму: "Кесарава – кесару, божае – богу". Стараабрадніцкія святары ў сваіх богаслужэннях упаміналі імя імператара, але называлі яго толькі "высакародным", а не "набожным і благаверным", як патрабавалася па ніканаўскай рэформе. Папоўцы адкрыта і актыўна выступалі супраць урадавай царквы, якую лічылі "прадажнай блудніцай".

У папоўцаў былі свае святары і ўвесь духоўны лад. Яны лічылі, што пераемнае права правядзення таінстваў, якое передаецца пасвячэннем і памазаннем, захавалася толькі ў пяці ўсяленскіх цэрквах, адна з якіх – руская. Паколькі таінствы праведныя, а рашэнні ўсяленскіх і іншых сабораў не страцілі сілу і нязменныя, то існуючая з часоў Нікана праваслаўная царква з яе рэформамі ёсць царква ератычная, а ў ёй гаспадарыць антыхрыст.

Папоўства бярэ свой пачатак з той самай крыніцы, што і беспапоўства, адрозненнем было тое, што папоўцы прымалі збеглых папоў. Унутрыпалітычныя падзеі ў Рускай дзяржаве прывялі да таго, што папоўства станавілася неаднародным, у ім утварыліся розныя сагласы. Даследчыкі называюць розную колькасць гэтых сагласаў, напрыклад, даследчык стараабраднiцтва ХУШ ст. А.І. Жураўлёў асноўнымі называе пяць: *веткаўскі, дыяканаўскі, перамазанаўскі (іаржэнцы), епіфанеўскі, чарнобальскі.* Даследчык

стараабраднiцтва XIX ст. П.С. Смiрноў колькасць сагласаў даводзiць да дзесяцi. Адзначым, што з-за разыходжанняў у тлумачэннi паняццяў "саглас" i "толк" дакладна вызначыць колькасць сагласаў цяжка.

Папоўства першапачаткова з'явiлася ў выглядзе збеглапапоўства, першыя абшчыны якога былi заснаваны ў Нiжагародскiм, Данскiм, Чарнiгаўскiм краях i ў Рэчы Паспалiтай.

У Чарнiгаўскай губернi цэнтрам папоўства стала Старадуб'е. Iдэi расколу сюды прынёс маскоўскi свяшчэннiк Казьма, якi не падпарадкаваўся рашэнням сабора 1666 – 1667 гадоў i ўцёк з Масквы да свайго сябра, старадубскага палкоўнiка Гаўрылы Iванова. З Казьмою ўцяклi яшчэ дваццаць яго аднадумцаў.

Ужо ў першай палавiне XУIII ст. папоўства канчаткова адасобiлася ад беспапоўства. Разам з тым у папоўстве пачалi ўзнiкаць рознагалоссi i спрэчкi, што прывяло да ўтварэння трох новых сагласаў: *веткаўскага, дыяканаўскага i епiфанеўскага.* У стараабраднiцтве выдзяляўся папоўскi саглас, якi прымаў *белакрынiцкае* свяшчэнства. Вырашэнне сваёй праблемы папоўцы пачалi з стварэння ўласнай Белакрынiцкай мiтрапалii. Гэтае пытанне мае значэнне не толькi для гiсторыi стараабраднiцтва, але i для палiтыкi Расii таго часу. Роля ж мiтрапалiта Амвросiя, якi быў запрошаны абаронцамi старога абраду, ацэньваецца неадназначна як гiсторыкамi стараабраднiкамi, так i гiсторыкамi афiцыйнай Рускай праваслаўнай царквы.

Прыгнечаная частка стараабраднiкаў, якая адмаўляла ўсякi кампрамiс з дзяржавай i афiцыйнай праваслаўнай царквою, утварыла беспапоўства. Яго каранi маюць свае асаблiвасцi як сацыяльныя, так i гiсторыка-геаграфiчныя.

Клiматычныя ўмовы поўначы Русi не спрыялi земляробству, таму гэтае месца мала прыцягвала памешчыкаў. У асноўным тут жылi чарнасошныя сяляне, якiя iснавалi за кошт розных промыслаў: рыбалоўства, палявання, салеварэння, здабычы рачнога жэмчугу, збiральнiцтва ягад i грыбоў, распрацоўкi балотных руд. Частка сялян займалася кавальскiмi справамi, будаўнiцтвам суднаў, чаканкай на срэбры i золаце, вышываннем залатой нiткаю.

Такiм чынам, доўгi час на поўначы ствараліся ўмовы для ўзнiкнення народнай апазiцыi, якая ў той перыяд набывала палiтычную афарбоўку ў выглядзе рэлiгiйнага пратэсту, або "расколу". Але тут "раскол" меў своеасаблiвы характар. Калi на поўднi ўтваралася патрыярхальнае папоўства, то на поўначы – плебейскае, у яго ўваходзiлi паўсялянскiя элементы. Як вынiкае, беспапоўства - гэта светапогляд неаднародных сялян, якiя паступова збаўлялiся ад шматвяковых традыцый. У беспапоўстве галоўнымi пытаннямi абмеркаванняў i спрэчак сталi Бог i цар. Беспапоўства характарызавалася стыхiйнасцю пратэсту супраць сацыяльнага зла, пошукам праўды як нябеснай, так i зямной.

Яшчэ ў 1654 г. iдэолаг расколу I. Няронаў гаварыў аб тым, што ў вынiку рэформы Нiкана руская праваслаўная царква страцiла набожнасць. У далейшым у найбольш радыкальна настроеных абаронцаў "старой веры" з'яўляецца



суджэнне аб тым, што ў свеце ўсталяваўся антыхрыст, ён знiшчае ў праваслаўi сапраўдную веру, а свяшчэнства трапiла ў нiканаўскую ерась, прапаведнiкi новага пад выглядам чатырохканцовага крыжа стварылi сабе кумiра пад iмем Иисус (з дзвюма лiтарамi "и"), пакланяюцца антыхрысту, апаганiлi таiнствы, змянiлi верапавучальныя прынцыпы i г.д. Ужо першапачаткова беспапоўцы адмовiлiся ад iнстытута свяшчэнства (адсюль iх назва), а значыць, не было патрэбы праводзiць шэраг таiнстваў, дзе неабходна прысутнасць свяшчэннiка. Канчаткова беспапоўства сфармiравалася ў 90-х гадах XУII ст. У iм паступова пачалi ўтварацца свае сагласы: *паморскi саглас, федасееўскi, фiлiпаўскi (спальшчыкi або марэльшчыкi), нетаўскi (спасавы саглас), пастуховы (адамантавы саглас).* Неабходна адзначыць, што з пералiчаных сагласаў у далейшым утварыўся яшчэ не адзiн дзесятак розных толкаў.

Будучы першапачаткова з'явай толькi царкоўнага жыцця, раскол у далейшым закрануў усе бакi грамадскага жыцця: стаў прычынай мiграцыi людзей, "запалiў" вогнiшчы самаспальвання, нарадзiў турмы i катаваннi. У вынiку антынародных дзеянняў улад i царквы рускi чалавек у другой палавiне XУII ст. у сваiм родным доме аказаўся iзгоем. Ваяваць са знешнiм ворагам, весцi гаспадарку ён умеў добра, але ў сiтуацыi, якая склалася, разгубiўся. Народу былi незразумелымi крокi цара i патрыярха, калi яны аб'явiлi ератычным усё тое, што выхоўвалася стагоддзямi, змяшчалася ў кнiгах, па якiх засвойвалi першапачатковую грамату дзецi. Гiсторыя рыхтавала рускаму народу цяжкiя выпрабаваннi не на адно стагоддзе, а адзiны ў сваёй веры народ раздзялiўся на абаронцаў даўнiны (стараабраднiкаў) i прыхiльнiкаў нiканаўскай царквы. Сацыяльна-эканамiчныя i iдэалагiчныя ўмовы канца XУII – пачатку XУIII ст. прывялi да таго, што самi стараабраднiкi пачалi дзялiцца на сагласы i толкi, а ўнутрыпалiтычнае становiшча Рускай дзяржавы прымусiла iх мiграваць за мяжу. Апынулiся абаронцы старога абраду i на беларускiх землях.

**Трэцяя глава** прысвечана стараабраднiцкаму руху на Беларусi.

З'яўленне абаронцаў старога абраду на беларускiх землях звязана з абвастрэннем класавых супярэчнасцей у Рускай дзяржаве ў XУII ст. i з барацьбой вакол царкоўнай рэформы. Перасяленне за мяжу, асаблiва ў Рэч Паспалiтую, давала стараабраднiкам магчымасць зберагчы маёмасць i старыя абрады, таму што тут не лiчылi "раскол" ерассю, вернiкаў не падвяргалi ганенням.

Стараабраднiкi траплялi на паўночныя землi Рэчы Паспалiтай з Памор'я i Ноўгарада. У вынiку перасялення на паўночныя землi ў большасцi траплялi паморцы, федасееўцы i фiлiпаўцы. Яны аселi ў гарадах Дынабурзе, Браславе, Полацку, Себежы, Невелi, Вiцебску, Лепелi, Оршы, Сянно, Велiжы; у Полацкiм ваяводстве; Аршанскiм i Вiцебскiм паветах Вiцебскага ваяводства.

На паўднёва-ўсходнiя землi большай часткай траплялi папоўцы i ў невялiкай колькасцi беспапоўцы (паморцы i федасееўцы). У гэтым раёне асноўнымi гарадамi iх пасяленняў былi Чэрыкаў, Магiлёў, Копысь, Гомель,

Ветка, а таксама землі Мсціслаўскага ваяводства і Рэчыцкага павета Менскага ваяводства.

Перасяленню стараабраднікаў на землі Рэчы Паспалітай спрыялі і яе ўнутраныя абставіны. Так, войны сярэдзіны ХУП ст., а таксама Паўночная вайна нанеслі гарадам і мястэчкам вялізарныя страты. Большасць з іх была разбурана і спалена. Каб выправіць становішча, улады прынялі спецыяльныя пастановы, згодна з якімі ў другой палавіне ХУП ст. вызваляліся ад выплаты падаткаў на некалькі гадоў Віцебск, Полацк, Браслаў, Орша, Магілёў, Ашмяны, Гродна, Брэст і некаторыя іншыя гарады. Вялікія страты былі прычынены паветам. Напрыклад, Браслаўскі павет пад час войнаў быў поўнасцю апустошаны. Працавітыя і прадпрымальныя стараабраднікі траплялі першапачаткова ў гэтыя гарады і паветы, выкарыстоўваючы падатковыя прывілеі і магчымасць хуткай адаптацыі і назапашвання капіталу.

У кожным з названых рэгіёнаў жыццё стараабраднікаў мела свае асаблівасці. Беспапоўцы, якія ў большасці пасяляліся на паўночных беларускіх землях, складалі найбольш прыгнечаную частку сялянства і іншых саслоўяў, таму яны адмаўлялі любы кампраміс з дзяржавай і пануючай царквой. У сваіх службах яны ў асноўным адмаўляліся маліцца за цара. Пад уплывам гэтых асаблівасцей складалася духоўнае жыццё беспапоўцаў. Яны не будавалі вялікіх і багатых храмаў; часта пераязджалі з месца на месца, што не давала магчымасці весці іх дакладны ўлік; яны былі больш адасобленымі і замкнутымі.

Да папоўцаў, якія пасяліліся пераважна на паўднёва-усходніх землях, адносіліся ў асноўным заможнае сялянства, рамеснікі, купцы. Ідэалогія папоўцаў давала ім магчымасць будаваць, прычым вельмі хутка, храмы, якія нічым не ўступалі праваслаўным храмам.

Асаблівае месца ў гісторыі стараабрадніцтва на Беларусі займае Ветка. Хутка на востраве Ветка сабралася вялікая колькасць прыхільнікаў старога абраду. За некалькі вёрст ад вострава былі створаны слабады: Касецкая, Раманаўская, Лявонцьеўская і Веткаўская. І тут Казьма і Стэфан адпраўлялі ўсе службы, акрамя літургіі.

Геаграфічнае размяшчэнне веткаўскіх слабод, палітычнае становішча Рэчы Паспалітай давалі надзею стараабрадніцкім лідэрам і іх прыхільнікам на доўгае пражыванне. Яшчэ больш узмацнілася становішча стараабраднікаў на гэтых землях, калі зрабіла свае высновы спецыяльная ўрадавая камісія (сакратар камісіі А.М. Пацей), створаная ў 1690 годзе "для азнаямлення з новай верай". Камісія не знайшла ніякай схізматычнасці і канстатавала, што стараабраднікі не належаць да ліку небяспечных для дзяржавы і царквы сектантаў. Такія абставіны дазвалялі паляпшаць умовы жыцця, у тым ліку і духоўнага. У 1695 г. на Ветцы была асвечана царква ў імя Пакрова Прасвятой Багародзіцы дзевы МАрыі на старажытным антымінсе. З гэтага часу пачынаецца новая эпоха ў гісторыі ўсяго папоўства. Ветка становіцца цэнтрам усяго папоўства.

У другой палавіне ХУШ ст. на паўночных беларускіх землях, галоўным чынам паблізу расійскіх межаў – усходняя частка Дынабургскага, Рэжыцкага і



частка Люцынскага паветаў – з беспапоўскага накірунку жылі федасееўцы. Дакладных дадзеных пра час пасялення стараабраднікаў па ўсіх беларускіх гарадах, мястэчках і вёсках не знойдзена. Вядомыя пакуль паасобныя даты і падзеі, а больш поўны матэрыял прадстаўлены XIX і XX ст. Справа ў тым, што стараабраднікі, як правіла, пранікалі на беларускія землі тайком і сяліліся ў глухіх і непраходных лясах. Праходзіў час, пакуль іх паселішчы станавіліся вядомыя землеўласнікам, на абшарах якіх стараабраднікі жылі. Вялікую цікавасць, у плане атрымання гістарычнай інфармацыі пра першыя пасяленні і першыя пабудаваныя стараабраднікамі храмы на беларускіх землях, уяўляе "Дегуцкий летописец", які быў знойдзены ў 1973 г. у час археаграфічнай экспедыцыі Пушкінскага Дома ў Прыбалтыцы. Падзеі летапісу адносяцца як да гісторыі Расіі, так і да гісторыі сумежных дзяржаў.

Першыя паселішчы стараабраднікаў федасееўцаў былі адасобленымі, размяшчаліся здалёк ад паселішчаў іншаверцаў. Стараабраднікі стараліся захаваць чысціню сваёй веры, свае абрады, звычаі і традыцыі. "Дегуцкий летописец" сведчыць, што стараабраднікі спачатку з'явіліся ў Дынабургскім павеце.

У рукапісным аддзеле Літоўскай нацыянальнай бібліятэкі імя Марцінаса Мажвідзіса намі знойдзены цікавы дакумент: "Положение старообрядцев в Ковенской губернии", дзе паведамляецца, што пасяленне ў губерню стараабраднікаў розных сагласаў адбылося ў 1655 г., а аднымі з першых месц, дзе яны пасяліліся, былі землі вакол Браслава, Салок і Відзаў. Таму можна меркаваць, што на землях сучаснай Браслаўшчыны стараабраднікі з'явіліся ў 1655 г. яшчэ да афіцыйнага расколу Рускай праваслаўнай царквы. У 1660 г., як адзначаецца ў "Дегуцком летописце", у вёсцы Лігінішкі, паблізу ракі Дзвіны недалёка ад г.Дынабурга, быў заснаваны храм, а ў 1667 г. сюды прыйшоў свяшчэннаіерэй Цярэнцій, "старажытнаправаслаўнага хрышчэння і пасвячэння існы, які святаайцоўскія паданні моцна і надзейна захоўвае". Далей гаворыцца, што прыбыў ён з сынам і жыў набожна.

Другім месцам буйнога пасялення стараабраднікаў стала ўсходняя частка цяперашняй Віцебскай вобласці. (Тады гэта былі Полацкае і Віцебскае ваяводствы). У гэтых месцах, як адзначае ў сваёй кнізе В.І. Волкаў, беспапоўцы федасееўцы пасяліліся ў пачатку ХУШ ст. Пра першае ж з'яўленне вялікаросаў у Полацкім ваяводстве А. Семянтоўскі паведамляе наступнае: "Великороссы появились в г.Динабурге между 1656 и 1667 годами, когда город этот носил название Борисово-Глебска и начиная с 1563 г. в течение последующих 18 лет в городе Полоцке и его окрестности", а ў Віцебску яны з'явіліся яшчэ раней – у 1552 г. А. Семянтоўскі называе іх духаборцамі.

На цяперашняй тэрыторыі Віцебскай вобласці жылі і стараабраднікі папоўцы. У 1735 г. і 1764 г. папоўцы веткаўскага сагласа пасяляюцца ў Віцебску, Полацку, Лепелі і іх ваколіцах. У гэтыя гады па царскіх указах з Веткі і яе ваколіц было здзейснена два выгнанні і частка стараабраднікаў, якім удалося пазбегнуць "лавушак" рускіх войскаў, перасяліліся ў гэтыя мясціны.

Гвалтоўнае высяленне стараабраднікаў было здзейснена таксама з паўночна-ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай у 1736 г. На адным з сеймаў Літоўскай дзяржавы адзначалася, што рускімі войскамі гвалтоўна выселена больш за 60 тыс. федасееўцаў.

У канцы 70-х гадоў ХУІІІ ст. на землях Віцебшчыны з'яўляюцца філіпаўцы. Дзяленне стараабрадніцтва на сагласы і толкі закранула і паморцаў, з якіх першымі выдзеліліся філіпаўцы, якія яшчэ мелі назву спальвальнікі і марэльшчыкі. Кіраўніком філіпаўцаў, як ужо адзначалася, выступіў былы стралец Фоцій Васільеў, у манастве Філіп. В. Волкаў адзначае, што філіпаўцы прыйшлі на Віцебшчыну з Наўгародскай губерні, каб пазбегнуць урадавага суда за рабаванне праваслаўных цэркваў і манастыроў. З гісторыі вядома, што ў 1765 г. філіпаўцы ўварваліся ў Зелянецкі праваслаўны манастыр Наўгародскай епархіі, выгналі адтуль манахаў, абрабавалі царкву (забралі з сабою іконы і старажытныя рэчы) і падпалілі манастыр. Частка філіпаўцаў самаспалілася ў гэтым манастыры. Зыходзячы з гэтага, трэба меркаваць, што філіпаўцы ўцяклі на Віцебшчыну не раней як у 1765 г.

У Мінскім ваяводстве стараабраднікі з'явіліся ў 1735 г., пасля выгнання іх з Веткі. Пасяліліся яны ў непраходных лясах Бабруйскага і Барысаўскага паветаў, якія з часам сталі пастаянным месцам жыхарства для беспапоўцаў федасееўскага і філіпаўскага сагласаў. Другая хваля перасяленняў у Бабруйскі і Барысаўскі паветы была ў 1765 г., калі стараабраднікаў паўторна выгналі з Веткі. Першапачаткова абаронцы старога абраду арэндавалі зямлю, а потым пачалі набываць яе ва ўласнасць.

З прычыны абмежаванай тэрыторыі і невялікай колькасці сагласаў і толкаў беларускія землі сталі тым месцам, дзе абаронцы старога абраду здолелі стварыць строгую цэнтралізацыю, кіруючыя цэнтры, напісаць свой Статут. Тут таксама рабіліся спробы займець свайго епіскапа і стварыць адзіны стараабрадніцкі папоўскі цэнтр. Усё гэта трывожыла расійскі ўрад, які не хацеў мець каля сваіх граніц непакорлівых і, што таксама важна, з'арганізаваных падданых. З мэтай іх вяртання на ранейшае месца жыхарства расійскі ўрад праводзіў так званую "запрашальную" палітыку, якая, аднак, вялікага поспеху не мела. Вынікам гэтай палітыкі сталі два выгнанні стараабраднікаў рускімі войскамі ў 1735 г. і ў 1764 г., якія насільна ўварваліся ў межы Рэчы Паспалітай.

У пачатку XIX ст. на беларускіх землях заставалася яшчэ вялікая колькасць стараабраднікаў. Напрыклад, веткаўскія слабоды былі заселены пераважна тымі, каму ўдалося схавацца ад рускіх войскаў, а таксама стараабраднікамі, якія вярнуліся са Старадуб'я, куды былі пераселены ў час "выганкі" 1764 г. Аднак колькасць стараабраднікаў у веткаўскіх слабадах на пачатак XIX ст. была ў два разы меншая, чым перад "выганкай" у 1764 г.

Павялічылася колькасць стараабраднікаў у Бабруйскім і Барысаўскім паветах Мінскай губерні: сюды частка іх перасялілася падчас "выганкі" 1764 г. У меншай ступені "выганкі" закранулі стараабраднікаў Віцебскай губерні, аднак і тут рускія войскі перыядычна праводзілі рэйды ў пошуках абаронцаў старога абраду.



Трэба адзначыць, што на пачатку XIX ст. збеглыя з Расіі стараабраднікі пражывалі ва ўсіх беларускіх губернях.

З развіццём капіталістычных адносін стараабраднікі сяліліся ў мястэчках, прыгарадах і гарадах. У пачатку XIX ст. цэнтрамі стараабрадніцтва на Віцебшчыне з'яўляліся Дынабург, Рэжыца, Браслаў, Відзы, Дзісна, Полацк, Лепель, Гарадок, Сураж, Невель, Веліж; у Магілёўскай губерні: мястэчка Ветка, гарады Магілёў, Гомель, Рагачоў, Орша, Сянно, Чаусы, Добруш; у Мінскай губерні: гарады: Бабруйск, Барысаў, Рэчыца, Мозыр, Нясвіж. У канцы 20-х гадоў XIX ст. у мястэчках і гарадах назіраецца павелічэнне колькасці стараабраднікаў, калі ў 1816 г. у Відзаўскай парафіі пражывала 202 стараабраднікі, то ў 1826 г. толькі ў двух маёнтках (Відзы Альбрэхтоўскія і Відзы Лаўчынскія) – 221 чалавек. У 1853 г. у Відзах ўжо было 391 стараабраднік. У 1842 г. у Беліцы Магілёўскай губерні пражывала 553 стараабраднікі, а ў 1843 г. 571.

Рост колькасці стараабраднікаў у мястэчках і гарадах тлумачыцца тым, што яны ўцякалі туды ад памешчыцкай эксплуатацыі і разарэння. У гарадах, з дапамогай аднадумцаў, яны знаходзілі прытулак і працу. Трэба адзначыць, што ў большасці сваёй стараабраднікі на Беларусі былі людзьмі стараннымі, працавітымі, дзелавымі.

Адным з самых складаных і насычаных фактамі і падзеямі перыядаў у гісторыі стараабрадніцтва была другая палавіна XIX ст. і пачатак XX ст. У гэты час вельмі хутка вырашаліся працэсы, на якія, здавалася б, патрэбны дзесяцігоддзі. Праблемы стараабрадніцтва пачалі разглядацца даследчыкамі розных навуковых напрамкаў. Даследы, якія пачаліся ў другой палавіне ХУІІ ст. як багаслоўскія спрэчкі ўнутры Рускай праваслаўнай царквы, у другой палавіне XIX ст. закранулі грамадскае, эканамічнае і дзяржаўнае жыццё Расіі. Змянілася ўнутраная сітуацыя і структура дзейнасці ўрадавых ведамстваў, а праблема стараабрадніцтва змянілася настолькі, што ўзнікла неабходнасць даць стараабраднікам пэўныя грамадзянскія правы і свабоды. Аднак вырашыць гэтую праблему было няпроста з-за многіх прычын, але, па-першае, з-за адсутнасці прадуманай сістэмы дзеянняў, якая магла б змяніць сітуацыю; па-другое, афіцыйная праваслаўная царква не ішла на кампрамісы; па-трэцяе, не было ўзгодненасці пастаноў і рашэнняў, якія прымаліся рознымі ведамствамі. І бадай што, найважнейшай прычынай была адсутнасць свабод для стараабраднікаў і наяўнасць сакрэтнасці ў адносінах да праблемы "расколу".

Гэтак жа няпроста было вырашыць пытанне аб стараабрадніках, якія жылі на беларускіх землях. Тут яшчэ дабаўляліся і свае праблемы, перш за ўсё, звязаныя з землекарыстаннем. Акрамя гэтага ўраду ўдалося дабіцца таго, што ў многім змяніўся спосаб жыцця стараабраднікаў: было ўведзена ў богаслужэнні абавязковая малітва за цара, пачалі прызнавацца шлюбы, пашпарты і інш.

Адным з паказчыкаў нарастаючага крызісу царскай сістэмы быў сялянскі рух. Калі ў першай трэці ХІХ ст. адбылося 46 буйных сялянскіх выступленняў, то ў другой трэці – болей за 90. У Беларусі сацыяльныя супярэчнасці былі звязаныя і з нацыянальна-рэлігійнымі адрозненнямі паміж сялянамі і памешчыкамі. Гэтыя супярэчнасці асабліва ўзмацніліся пасля паўстання 1863 г., "…калі стараабраднікі аказалі ўраду значныя паслугі пры падаўленні мецяжу".

Мае сваю адметную гісторыю на Беларусі і аднаверства. Аднаверства было ўмоўным яднаннем стараабраднікаў з праваслаўнай цэрквай.

Урад і Сінод разумелі, што ўвесці аднаверства на Ветцы, дзе стараабраднікі вызначаліся асаблівай стойкасцю, будзе няпроста. Каб раз'яднаць стараабраднікаў Веткі ўрадам было зроблена многа намаганняў.

**Чацвертая глава** прысвечана гаспадарча-этнаграфічным асаблівасцям жыцця стараабраднікаў на Беларусі.

На землях Веткаўшчыны, што ўваходзілі ў Менскае ваяводства, а пазней у Магілёўскую губерню, пражывала найбольшая колькасць стараабраднікаў. Як у Ветцы, так і ў цэлым на Гомельшчыне, земляробства было выгадным, тут былі спрыяльныя прыродныя ўмовы, урадлівая глеба і добры клімат. Пры дастатковым угнаенні зямля давала добрыя ўраджаі. З азімых збожжавых стараабраднікі высявалі пераважна жыта, у нязначнай колькасці пшаніцу, з яравых – пераважна авёс, грэчку, ячмень, каноплі, лён, у нязначнай колькасці яравую пшаніцу, гарох, чачавіцу, проса. Вялікімі былі пасевы бульбы, якая ішла як на харчаванне людзей, так і на корм жывёле. Вырошчваліся таксама буракі, галоўным чынам для патрэб хатняга ўжытку. Усе пералічаныя культуры высяваліся ў канцы ХУІІ ст. і ў ХУІІІ ст. пры трохпольнай сістэме севазвароту.

У ХУІІІ ст. на землях, дзе пражывалі стараабраднікі, назіраецца спецыялізацыя паасобных паветаў. У Сенненскім і Магілёўскім паветах і ў слабадзе Новая Мільча Рэчыцкага павета (пасля падзелу Рэчы Паспалітай яны ўваходзілі ў Магілёўскую губерню) стараабраднікі вырошчвалі таварны лён не толькі на землях уласных, але і на арандуемых. У ХІХ ст. за арэнду дзесяціны зямлі пад лён у Магілёўскім і Сенненскім паветах плацілі за аблогу ад 5 да 10 руб., а за ўгноеную зямлю (у слабадзе Новая Мільча Гомельскага павета) – па 55 руб. за дзесяціну. Ільняное семя стараабраднікі прадавалі па цане 1 – 1,55 руб. за пуд, а льносаломку – 3 – 4 руб. за пуд. Свае палі стараабраднікі добра ўгнойвалі і атрымлівалі вышэйшы, чым сяляне-беларусы, ураджай.

У перыяд сяўбы і ўборкі ўраджаю стараабраднікі Гомельшчыны дапамагалі адзін аднаму, асабліва пры сяўбе, уборцы, мачэнні і падборцы таварнага ільну.

У ХІХ ст. больш заможныя стараабраднікі побач з трохполлем пачалі выкарыстоўваць шматпольную сістэму севазвароту. У другой палавіне ХІХ ст. мелі свае землі і свае гаспадаркі ў Рэчыцкім павеце Зубаў Іван Мацвеевіч (75 дзесяцін зямлі), Гарбуноў Грыгорый Міхайлавіч (60 дзесяцін зямлі), Фількоў



Васілій Ларыёнавіч (38 дзесяцін зямлі), Худобнікаў Пётр Ларыёнавіч (30 дзесяцін зямлі), Пчолаў Купрыян Васільевіч (33 дзесяціны зямлі).

Займаліся стараабраднікі і жывёлагадоўляй. Жывёла ў іх была больш пародзістая, чым у мясцовага насельніцтва. Каровы і коні, як правіла, рускай пароды, былі большыя па сваіх паказчыках і пераўзыходзілі мясцовае пагалоўе. Гэта былі ў асноўным пароды кароў і коней, якіх стараабраднікі прывозілі з Варонежскай і Тамбоўскай зямель.

Эфектыўна займаліся стараабраднікі і агародніцтвам. Гэты від дзейнасці быў добра развіты вакол Гомеля, Рэчыцы, Добруша, Магілёва і буйных слабод. Высокі даход атрымлівалі ад продажу капуснай расады, агуркоў, цыбулі і капусты. Прыбытак залежыў ад спрактыкаванасці агародніка, велічыні агароду і ўраджаю агародніны. У першай палавіне ХУІІІ ст. агародніцтва вакол Гомеля мела ўжо таварны характар. Тут ім займаліся Кірыл Рудак (меў ½ валокі зямлі, 3 сенажаці, плаціў 9 злотых і 1 грош чыншу), удава Герасімава-Міхайлава (мела ½ валокі зямлі, 3 сенажаці, 3 агароды, плаціла 5 злотых і 2 грошы чыншу), Павел Шванскі (меў ¼ валокі зямлі, 2 сенажаці, 2 агароды, плаціў 6 злотых 10 грошаў чыншу), С. Канавалёнак (меў ½ валокі зямлі, 6 сенажацяў, 1 агарод, плаціў 7 злотых 6 грошаў чыншу). Падчас першага выгнання стараабраднікаў з беларускіх зямель агародніцтву іх была прычынена вялікая шкода. У 1736 г. страты агароднікаў Гомеля склалі 488 злотых.

У ХІХ ст. стараабраднікі расшырылі агародніцтва вакол гарадоў і буйных слабод. Маючы ўласныя агароды, яны бралі ў арэнду пад агароды землі, размешчаныя непадалёку ад гарадоў і буйных населеных пунктаў. За дзесяціну арандаванай пад агарод угноенай зямлі яны плацілі за сезон ад 20 да 40 руб. Асобныя гаспадары, якія спецыялізаваліся толькі на агародніцтве, атрымлівалі ў сярэдзіне ХІХ ст. да 300 руб. даходу за сезон.

У пачатку ХІХ ст. стараабраднікі на Гомельшчыне і Магілёўшчыне эфектыўна займаліся садаводствам і арэндай садоў. У вялікіх памерах было развіта садаводства ў Гомельскім павеце. У прадмесцях Гомеля, Беліцы, Добруша, Агародні-Гомельскай і ў буйных слабадах стараабраднікі мелі сады, якія прыносілі да 800 руб. даходу ў год. Пры некаторых садах былі гадавальнікі на некалькі тысяч саджанцаў. Маладыя дрэўцы – ад двух да чатырох гадоў – увосень выкопвалі і развозілі па паветах губерні, а іншы раз і ў суседнія губерні – для продажу. За дрэўца з пасадкай на месцы і з падсадкай (г.зн. пры ўмове калі дрэўца "не прымецца", - у наступным годзе пасадзіць новае) плацілі ад 50 кап. да 1 руб. 50 кап. і больш, у залежнасці ад велічыні саджанца, яго якасці і сорту. За арэнду вялікіх садоў стараабраднікі плацілі за сезон па 2000 руб. Садавіну з такіх гаспадарак прадавалі ў Маскве, Пецярбургу, Старадуб'і, Кіеве.

Надзвычай разнастайнымі былі заняткі і промыслы стараабраднікаў Гомельшчыны. У канцы ХУІІІ ст. тут пражывалі багатыя купцы-стараабраднікі, якія на сотні тысяч рублёў гандлявалі збожжам, соллю, лесам, а таксама коньмі і жывёлай; дробныя гандляры прадавалі вырабы мясцовых рамеснікаў. Сярод стараабраднікаў былі лоцманы, рамізнікі і возчыкі, цесляры, муляры,

фарбавальшчыкі і суднаўладальнікі, і такія, што займаліся фрахтаваннем. Шмат хто займаўся адыходным промыслам.

Высокага ўзроўню дабрабыту дасягнулі ў XVIII ст. стараабраднікі, якія жылі на беларускіх землях. Асабліва славіўся гандаль. Веткаўскія купцы былі вядомымі ў Маскве, Пецярбургу, Кіеве, Рызе, Варшаве, Вільні і іншых гарадах. Інтэнсіўным быў гандаль са Старадуб'ем.

Разнастайнымі былі промыслы стараабраднікаў Гомельшчыны і Магілёўшчыны. Многія з іх на працягу XVIII і XIX стст. былі суднаўладальнікамі. На прыстанях Сожа і яго прытоках, у Ветцы, Гомелі, каля Беліцы і Пеставатай, у вёсках Скітка, Дзятлавічы, у Новых Церашковічах будаваліся берліны (невялікія судны), гаспадары якіх займаліся сплавам грузаў (фрахтам). Яны наймалі рабочых, звычайна сваіх аднадумцаў, бралі на свае берліны розны груз і атрымлівалі за сплаў у сярэдзіне XIX ст. ад 15 да 20 кап. і болей за пуд. На невялікае судна ўмяшчалася ад 10 да 12 тысяч пудоў грузу. За сезон гаспадары суднаў рабілі не менш як два сплавы. Тавар сплаўляўся ў Рыгу, Пецярбург, Кіеў, Дынабург, Віцебск. Некаторыя стараабраднікі былі лоцманамі, або, як іх называлі, "атаманамі" на плытах і барках у час сплаву лесу па рэках, асабліва па Сожы і Дняпры. "Атаманы" кіравалі рабочымі пры сплаве лесу. Атрымлівалі яны за тыдзень працы ад 7 да 10 рублёў.

Былі сярод стараабраднікаў прафесійныя цесляры, муляры, маляры і іншыя майстры, якія займаліся адыходнымі промысламі. Мужчыны ішлі ў гарады, галоўным чынам у Гомель, Кіеў, Маскву. За сезон зараблялі ад 100 да 150 руб. і болей.

Пэўныя асаблівасці былі і ў гаспадарчым жыцці стараабраднікаў Віцебшчыны. Асноўнай формай заняткаў стараабраднікаў тут было земляробства і падсобныя гаспадаркі ў межах свайго населенага пункта або невялікай тэрыторыі. Акрамя гэтага абаронцы старога абраду на Віцебшчыне займаліся рамесніцтвам і гандлем. Гандлявалі віцебскія стараабраднікі і за межамі сваёй губерні. Гандлявалі коньмі і рагатай жывёлай, птушкай, лесам і ільном, які куплялі ў сваіх аднадумцаў. Лес у вялікай колькасці сплаўляўся за мяжу. Галоўным шляхам для сплаву была рака Дзвіна і яе прытокі. У зімовы час лес падвозілі да берагоў рэк, рабілі плыты, а ўвесну сплаўлялі да месц прызначэння – у прускі горад Цільзіт. Будаўнічы лес сплаўляўся бярвеннямі або абчасанымі брусамі.

На Віцебшчыне стараабраднікі займаліся і адыходнымі промысламі, мелі падсобныя гаспадаркі. Яны займаліся лоўляй рыбы, возніцтвам, цяслярствам, выраблялі цэглу, арандавалі сады, у ваколіцах Браслава вязалі рыбалоўныя сеткі і рабілі снасці. Акрамя таго, значны даход атрымлівалі ад капання равоў і працы на чыгунцы. У другой палавіне XIX ст. у Новааляксандраўскім павеце значны даход стараабраднікам прыносіла рыбалоўства. З мясцовых азёраў багатымі на рыбу былі Дрысвяцкае (Браслаўскае) і Дрывяцкае. Асабліва багатым быў улоў судака і шчупака: у адзін заход выцягвалі да 500 пудоў рыбы. Занятыя пры гэтым стараабраднікі атрымоўвалі па 15 кап. ад тоны. Рыбу



прадавалі ў Дзвінску, Вільні, Варшаве. Добры даход давала і лоўля ракаў, якія сотнямі тысяч адпраўляліся за мяжу.

На Міншчыне, стараабраднікі з'явіліся пазней – у сярэдзіне XVIII ст. Другая хваля перасяленняў прыпадае пад канец XVIII ст. У 1735 г. і 1764 г. стараабраднікі, пасля выгнання іх з Веткі і часткова з Віцебшчыны, пасяліліся ў непраходных лясах Бабруйшчыны і Барысаўшчыны. Яны тут і аселі. Спачатку бралі зямлю ў арэнду, а пазней пачалі набываць яе ва ўласнасць. Зямлю стараабраднікі апрацоўвалі больш старанна, чым мясцовае насельніцтва, і атрымлівалі добры ўраджай. У гаспадарках стараабраднікаў і жывёла была лепшай пароды. У другой палавіне XIX ст., з першага студзеня 1875 г. па першае студзеня 1883 г., у Ігуменскім павеце 61 сям'я стараабраднікаў набыла сваю зямлю і эфектыўна займалася земляробствам. З іх 26 гаспадароў былі мяшчане, 35 - сяляне. Дзевяць гаспадароў мелі зямлі больш як па 100 дзесяцін, а астатнія – да 100 дзесяцін. Міхайлоўскі Васілій Пятровіч меў 139 дзесяцін зямлі, столькі ж зямлі мелі Наумаў Павел Ільін, Ларыонаў Кузьма Іванавіч, Кандрацьеў Агафон Максімавіч, 180 дзесяцін меў Недарэзаў Карп Клімавіч, 134 дзесяціны – Селязнёў Макарый Платонавіч.

Умовы жыцця стараабраднікаў на расійскіх і беларускіх землях дазволілі ім набыць вопыт ва ўзвядзенні драўляных пабудоў. Што датычыцца жылля, адзення, ежы, то трэба адзначыць, што, напрыклад, гомельскія стараабраднікі строга прытрымліваліся бацькоўскіх і дзедаўскіх асноў. Забудова стараабрадніцкіх двароў, як у гарадах і мястэчках, так і ў сельскіх паселішчах мела свае асаблівасці. У гарадах і мястэчках купцы і мяшчане мелі вялікія дамы, у якіх было 5 – 8 пакояў і болей, дахі пакрывалі гонтамі, бляхай і дошкамі ("тесом"), ля дахаў і над вокнамі былі разныя карнізы, звонку часта маляваныя.

Для жылых дамоў стараабраднікаў былі характэрныя галерэі, веранды, падзел жылля на жылую і чыстую часткі. У другой палавіне XIX ст. з'яўляюцца мураваныя пабудовы, галоўным чынам у Магілёўскай губерні. Тут, асабліва ў Ветцы, для знадворкавага дэкаратыўнага афармлення жылых дамоў шырока выкарыстоўвалася разьба па дрэву, так званая веткаўская разьба, якая вызначалася шматпланавасцю кампазіцыі, дзе пераважалі стылізаваныя раслінныя матывы. На Віцебшчыне ў арнаментальнай разьбе стараабраднікаў сустракаліся і геаметрычныя кампазіцыі.

Вызначалася сваёй адметнасцю ўнутраная планіроўка жылля стараабраднікаў: руская печ з палаткамі; наяўнасць ікон ва ўсіх жылых памяшканнях; наяўнасць ложкаў, крэслаў, куфраў.

Адрозніваліся стараабраднікі ад мясцовага насельніцтва і сваім адзеннем. Стараабраднікі ў адрозненне ад мясцовага насельніцтва мелі больш багатыя гаспадаркі, займаліся гандлем, адыходнымі промысламі і, як вынік, мелі магчымасць набываць больш дарагое адзенне. Фактарам росту дабрабыту стараабраднікаў трэба лічыць іх набожнасць, працавітасць, трывалыя сувязі са

сваімі аднадумцамі, якія жылі ў іншых рэгіёнах, а таксама іх у многім бескарыслівую ўзаемадапамогу.

**Пятая глава** прысвечана культурна-духоўным рысам стараабрадніцтва на Беларусі.

Стараабраднікі на беларускіх землях стварылі свае культурныя традыцыі, беражліва іх ахоўвалі і ўзбагачалі, як святыню перадавалі сваім нашчадкам. Сабраныя ў гарманічную сістэму абрадаў, жыццёвых правілаў, звычаяў, светаўяўленняў, гэтыя традыцыі з'яўляліся асновай жыццядзейнасці стараабраднікаў.

Духоўнае жыццё стараабраднікаў праходзіла, як правіла, у замкнутай старажытнахрысціянскай абшчыне. Грунтуючыся на сваіх паданнях, стараабраднікі толькі сябе лічылі сапраўднымі хрысціянамі. Іх абшчына мела сваю іерархію кіраўніцтва: ад вышэйшай ступені – апосталаў - да ніжэйшай - пракаў і духоўных настаўнікаў.

Цэнтрамі культурнага і духоўнага жыцця стараабраднікаў былі ў іх дыяспарах слабоды, манастыры, цэрквы і малельні. Цікавасць уяўляе Макар'еўскі манастыр, які знаходзіўся прыкладна за 15 вёрст ад Гомеля. Ён меў халодную і цёплую цэрквы. Халодная прызначалася на веснавы, летні і асенні час і не мела сістэмы ацяплення, цёплая мела сістэму ацяплення і выкарыстоўвалася ў зімовы час. Немалаважным з'яўляецца той факт, што халодныя культавыя памяшканні былі своеасаблівымі сховішчамі для старажытных дарагіх ікон, для якіх цяпло з'яўляецца адмоўным фактарам падчас захоўвання. Халодная царква была пабудавана з дрэва і мела шэсць купалаў, на кожным з якіх знаходзіўся крыж. Побач знаходзілася званіца, купал якой таксама быў увенчаны крыжам. Багата выглядаў іканастас. Пад Нерукатворнай іконай знаходзілася распяцце Ісуса Хрыста з меднай лампадай, вакол якога двума раздзяленнямі (радкамі) вісела 18 ікон. У другім і трэцім радках у пазалочаных ківотах і рамках было 30 ікон, у чацвёртым радку – дзевяць ікон у пазалочаных рамках, у пятым – шэсць вялікіх ікон. З правага боку ад Царскіх варот размяшчалася пяць ікон. Ікона Збавіцеля, у сярэбраным акладзе і з вянцом, мела даўжыню $1^1/_2$ аршына і такую ж шырыню. Перад вянцом вісела невялікая сярэбраная лампада, а над вянцом віселі дзве лепты. За іконай Збавіцеля размяшчалася пазалочаная ікона Уладзімірскай Божай Маці. Яна мела такую ж велічыню, як і ікона Збавіцеля, а над вянцом вісела лепта з тафты з невялікай сярэбранай лампадай. З левага боку ад Царскіх варот першай вісела ікона Казанскай Божай Маці даўжынёй у $1^1/_2$ аршына і шырынёй $1^1/_4$ аршына, пакрытая сярэбранай пазалотай. Вялікі верхні вянец іконы быў сярэбраны і пазалочаны, ніжні вянец меў памеры ¾ аршына даўжыні і ½ аршына шырыні. Жамчужны бераг ніжняга вянца ўпрыгожвалі 103 рознага колеру каштоўныя камяні, поле вянца аздаблялі восем вялікіх і 17 малых зорак з каштоўных камянёў. Перад іконай Казанскай Божай Маці на доўгім ланцугу вісела сярэбраная пазалочаная лампада. Драўляныя Царскія вароты былі пазалочаныя. На іх вісела шэсць ікон, перад якімі былі тры лампады, адна



медная і дзве фарфоравыя, з вялікімі свечкамі. Два аналоі былі абшытыя тканінай, на адным з іх, пакрытым яшчэ адной тканінай, ляжала Евангелле.

У паветах Віцебскай губерні малельні будаваліся і абсталёўваліся падобным чынам. У даўжыню і шырыню яны мелі ад 10 да 14 аршынаў, падлога і столь былі з дрэва. Абавязковай лічылася наяўнасць сеняў, адкуль дзверы вялі ў хату. З захаду, ля ўваходу, з правага боку два вакны выходзілі на вуліцу і адно, з левага боку, - у агарод. У малельні на процілеглай ад уваходных дзвярэй сцяне на ўсю даўжыню рабілі драўляную паліцу, на якой размяшчалася да 20 ікон. Перад кожнай іконай замацоўвалася да берагу паліцы свечка. Пасярэдзіне гэтай паліцы стаяў драўляны стол, які выкарыстоўваўся ў якасці прастола. Пакрываўся прастол шарсцяной тканінаю цёмнага колеру, абшытай у два радкі галунамі, а на пярэднім баку тканіны вышываўся крыж. Побач з прастолам стаяў стол меншых памераў, гэта быў ахвярнік, на ім стаялі дзве невялікія скрынкі. З бакоў гэтых двух сталоў стаялі два аналоі, пакрытыя паркалём. У правым кутку над іконнай паліцай знаходзіўся плецены кошык, у якім захоўваліся памінальныя кніжачкі. Тут жа ляжалі рознакаляровыя шарсцяныя і паркалёвыя "подручники", якімі карысталіся падчас зямных паклонаў. На сценах у розных месцах віселі "лестовки" і белыя ручнікі. На іконнай паліцы знаходзілася медная кадзільніца з ручкаю. Уздоўж сцен стаялі драўляныя лаўкі.

Веткаўскія манастыры і скіты былі не толькі асяродкамі духоўнага жыцця стараабраднікаў, але і цэнтрамі іх адукацыі і пісьменнасці, а таксама захавальнікамі старадрукаванага слова. Айцы і старцы, манахі і манашкі навучалі ў келлях хлопчыкаў і дзяўчынак, нярэдка і дарослых, азбуцы, чытаць Часаслоў і Псалтыр. Гэтых настаўнікаў, якія былі непасрэднымі пераемнікамі стараабрадніцкіх настаўнікаў, называлі майстрамі і майстрыхамі. Істотным у навучанні было патрабаванне, каб дзеці ўмелі чытаць "по силе", г.зн. захоўваючы націск у словах са стараабрадніцкім тлумачэннем, напрыклад, "вó веки", "нá Бога". Такое навучанне існавала тут з часу адкрыцця Веткаўскага манастыра. Гэтыя традыцыі былі перанесены і ў іншыя манастыры на Ветцы.

Дзякуючы асветніцкай дзейнасці веткаўскіх майстроў і майстрых, пашыралася граматнасць сярод стараабраднікаў, якія жылі ў Рэчы Паспалітай. У манастырах і скітах была сканцэнтравана вялікая колькасць рукапісаў і старадрукаваных кніг. Асабліва багатым на іх быў Веткаўскі Пакроўскі манастыр, аб чым сведчыць той факт, што ў 1735 г. палкоўнік Сыцін забраў у манахаў гэтага манастыра 682 кнігі. У Лаўрэнцьеўскім манастыры пэўны час захоўваўся выдатны рукапіс Івана Дамаскіна ў перакладзе князя Андрэя Міхайлавіча Курбскага.

Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што на беларускіх землях жыло шмат свяшчэннікаў, якія ўнеслі значны ўклад у гісторыю стараабрадніцтва, яго духоўнае жыццё, культуру і побыт. У стараабрадніцтве пакінулі свой след веткаўскія свяшчэннікі Козьма, Дасіфей, Стэфан з Бялёва, Іаасаф, Феадосій (Варыпін) з Рыльска, Аляксандр, Грыгорый.

Архіўныя матэрыялы сведчаць аб тым, што вядомыя старaабрадніцкія свяшчэннікі і духоўныя настаўнікі жылі доўгі час на беларускай зямлі, у прыватнасці на Ветцы, адкуль выйшла многа тэарэтыкаў папоўства. Тут на працягу XVIII ст. імі былі напісаны працы ў абарону старога абраду, пра маральныя нормы і правілы. Пад кіраўніцтвам гэтых лідэраў былі пабудаваны старaабрадніцкія манастыры і цэрквы.

Сярод старaабраднікаў, у тым ліку і тых, што жылі на беларускіх землях, было шмат таленавітых пісьменнікаў і паэтаў, якія ў сваіх творах паказвалі цяжкасці жыцця не толькі абаронцаў старога абраду, але і ўсяго народа, выяўлялі тагачасныя праблемы. Адным з іх быў Лысенін Цімафей Матвееў (другая палавіна XVII – пачатак XVIII стст.). Сярод яго шматлікіх рукапісных прац такія як, “Описание прения старца Феодосия с Тимофеем Лысениным… и с его единоволниками”, “Сказание вкратце о брани протопопа Аввакума с Феодором дъяконом о вере и о несогласных письмах Аввакумовых. Их же многая лета держал и веровал Ануфрий, и как потом отложил и похулил” і шэраг іншых. Аб высокім узроўні тагачаснай старaабрадніцкай літаратуры на беларускіх землях сведчаць і той факт, што ў пачатку XVIII ст. у Веткаўскім манастыры жылі і пісалі свае працы два філосафы Іаан Андрэеў і Фёдар. На Ветцы жыў Іван Філосаф – аўтар “Грамоткі” аб спосабе каджэння, напісанай у 1711 г. па просьбе веткаўскага старца Сергія. Значны след у старaабрадніцкай культуры пакінуў Іларыён Георгіевіч Кабанаў, які пэўны час пражываў на беларускай зямлі. Ім напісаны такія працы, як “История и обычаи Ветковской церкви”, “Окружное послание” і інш.

Наяўныя дадзеныя аб старaабрадніцкай літаратуры і самадзейнай творчасці дапамагаюць стварыць адзінае цэлае, якое па сваёй сутнасці з’яўляецца часткай культуры аб’ектыўнага свету. У творах старaабраднікі выказвалі свой светапогляд, сваю мадэль свету, адстойвалі ідэі духоўных айцоў, апісвалі канкрэтныя падзеі. Старaабрадніцкая літаратура і самадзейная творчасць характарызуюцца цэльнасцю і вобразнасцю. Перажыванні за сваю веру, за лёс радзімы з’яўляюцца важнейшымі кампанентамі старaабрадніцкай культуры, а таму можна гаварыць аб патрыятызме старaабраднікаў, іх вернасці радзіме, вернасці ідэям старажытнарускага праваслаўя.

**У ЗАКЛЮЧЭННІ** падсумаваны агульныя вынікі даследавання, стаўшыя асноўнымі палажэннямі, вынесенымі на абарону:

1. Шырокі рух за стары абрад, які ахапіў Маскоўскую дзяржаву, не быў аднародным. Старaабрадніцкі рух з самага пачатку стаў набываць сацыяльную афарбоўку, хоць як адкрытая апазіцыя праявіўся найперш сярод нізавога духавенства. Сацыяльная разнароднасць абаронцаў даўніны прывяла да таго, што старaабрадніцтва ўжо ў канцы XVII ст. распалася на дзве плыні – папоўства і беспапоўства, якія пазней распаліся на сагласы і толкі. Унутрыпалітычныя падзеі ў Рускай дзяржаве прывялі да таго, што частка рускіх старaабраднікаў перасялілася на беларускія землі і стварыла тут свае сагласы і толкі (1. С. 12 - 47; 2. С. 61 – 62).



2. Нельга не адзначыць уклад старaабраднікаў на беларускіх землях у развіццё вытворчасці, промыслаў, рамесніцтва, будаўніцтва, гандлю, у сельскагаспадарчую вытворчасць (1. С. 146 – 156).

3. Старaабраднікі на беларускіх землях стварылі адметнае будаўніцтва, промыслы і ўжытковае мастацтва. Бясспрэчную цікавасць уяўляе архітэктурная і мастацкая спадчына старaабраднікаў на беларускіх землях. Абаронцы старога абраду здолелі захаваць сваю адметнасць таксама ў абрадах, кульце і побыце (1. С. 156 – 164).

4. У разглядаемы перыяд узнікла і існавала, побач з беларускай культурай, культура рускіх старaабраднікаў. Жывучы на беларускай зямлі, старaабраднікі здолелі за кароткі тэрмін адрадзіць сваё духоўнае жыццё. Адметным было і тое, што як беларуская культура, так і культура рускай дыяспары “мірна” суіснавалі і амаль не змешваліся (3. С. 9 – 10; 9. С. 7 – 8).

5. Рускі ўрад рабіў намаганні вяртання старaабраднікаў з Рэчы Паспалітай выкарыстоўваючы першапачаткова так званую запрашальную палітыку. Але старaабраднікі вярталіся на сваю радзіму ў невялікай колькасці. І для рускага ўрада адзіным спосабам іх вяртання заставалася выкарыстанне ваеннай сілы, што прывяло да значных эканамічных страт з боку Рэчы Паспалітай. Многія вёскі і слабоды засталіся без жыхароў, ворныя землі не было каму апрацоўваць, зменшыліся падатковыя зборы (1. С. 78 – 92; 10. С. 67 – 71).

6. Асаблівасцю пражывання старaабраднікаў на беларускіх землях было тое, што яны праводзілі адкрытае спавяданне сваёй веры, мірна ўжываліся з мясцовым насельніцтвам, кантакты на духоўным і бытавым узроўнях былі зведзены да мінімуму. Старaабраднікі стварылі тут сваю культуру, якая адрознівалася ад культуры іх аднадумцаў, што жылі ў Расіі (5. С. 83 – 88; 6. С. 68 – 71; 1. С. 164 – 180).

7. Старaабраднікі на Беларусі ўмелі наладзіць сваё духоўнае жыццё так, што ў іх асяроддзі адукаваных людзей было больш, чым сярод праваслаўных, а ў канцы XIX ст. сярод іх можна было сустрэць людзей, якія мелі адукацыю на ўзроўні еўрапейскай (6. С. 66 - 71; 1. С. 164 - 199).

8. Умовы жыцця і культурна-духоўнага развіцця старaабраднікаў на беларускіх землях далі ім магчымасць выдзеліцца ў самастойную канфесію (1. С. 64 - 78; 164 - 180).

9. Погляды старaабраднікаў у палітычным плане нельга назваць стабільнымі. Яны заўсёды памяталі, што іх радзіма Расія, не парывалі кроўных сувязей з ёю, захоўвалі рускую мову, а ў час паўстання 1863 года яны сталі на бок рускіх войскаў, якія падаўлялі паўстанне (7. С. 18 – 22).

10 Палітыка Расійскай імперыі ў дачыненні да старaабраднікаў на беларускіх землях заўсёды была спецыфічнай. Пашырэнне ўплыву Веткі на ўсе папоўскія цэнтры ў Расіі, а таксама безвыніковасць “запрашальнай” палітыкі расійскага ўрада ў адносінах да сваіх суграмадзян і боязнь стварэння старaабраднікамі ўплывовай сілы прыводзілі да выкарыстання Расіяй розных шляхоў ( у тым ліку і ваеннага) вырашэння пытання.

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай расійскі ўрад пачаў ажыццяўляць захады па змяненні палітыкі ў дачыненні да стараабраднікаў, якія пражывалі ў беларуска-літоўскіх губернях. Палітычнае становішча на беларускіх землях прымушала расійскі ўрад шукаць тут шляхі ўмацавання сваіх пазіцый, дзеля чаго яму даводзілася лічыцца з асаблівасцямі жыцця тут стараабраднікаў і рабіць апошнім некаторыя ўступкі. Хоць уступкі гэтыя былі нязначныя, яны давалі расійскім уладам магчымасць аказваць свой уплыў на тутэйшых стараабраднікаў. Адметна тое, што павялічвалася іх колькасць. (1. С. 64 – 146).

СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ

**Манаграфія:**

1 Гарбацкі А.А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.ст.: Манаграфія. – Брэст: Выда-ва Брэсцкага дзярж. ун-та, 1999. – 202 с.
**Артыкулы**
2 Царкоўны раскол і стараверы на Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XIX стст. // Беларускі гістарычны часопіс. - 1997. - №4. - С. 60 – 66.
3 Старообрядцы на Белоруси // Падарожнік. - 1998. - №1. - С. 9 –10.
4 Староверчаская Белакрыніцкая мітраполія і мітрапаліт Амвросій у першай палавіне XIX ст. // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 3. - 1998. - №2. - С. 6 – 10.
5 Стараабрадцы-папоўцы – гісторыя ўзнікнення // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. - 1998. - №3. - С. 81 – 88.
6 Да вытокаў духоўнай спадчыны // Народная асвета. - 1998. - №12. - С. 63 – 71.
7 Сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і духоўнае жыццё стараабраднікаў Віцебшчыны ў другой палове XIX – пачатку XX стст. // Веснік Брэсцкага універсітэта. - 1999. - №1. - С. 17 – 23.
8 Гісторыя стараабрадніцтва Магілёўшчыны ў канцы XVII – першай палове XIX стст. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. – 1999. - №1. – С. 55 – 60.
9 Стараверы Віцебшчыны ў канцы XVII – XVIII ст.ст. // Веснік Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. – 1999. - № 1. - С. 3 – 8.
10 Палітыка Кацярыны II у дачыненні да стараабраднікаў. // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 1999. - №2. – С. 67 – 71.
11 Из истории старообрядчества // Третьи общественно-политические чтения, посвященные памяти К. Лыщинского. г.Брест, 1993. - Ч. 2. - С. 18 – 21.
12 Аб любві і дзесяці запаведзях Божых у стараавераў // Матэрыялы IУ чытанняў прысвечаных К. Лышчынскаму. г.Брэст, 1995. - С. 36 – 41.
**Тэзісы дакладаў:**
13 Национальное возрождение и церковь // Матэрыялы палескай навукова-практычнай канферэнцыі. г.Пінск, 1990. - С. 45 – 47.
14 Религия и общественное сознание // Материалы Республиканской научно-практической конференции "Политическая культура личности: проблемы, цели, средства" (29 – 30 октября 1991 года). Брест, 1992. - С.36 – 37.



15 Нравственное становление молодежи // Материалы республиканской научной конференции "Молодежь в изменяющемся мире" 22 – 24 сентября 1992 г. г. Брест, 1992. - С. 83 – 85.
16 Некаторыя асаблівасці веравучэння і культу стараавераў // Рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя "Праблемы чалавека ў сучасных філасофскіх і гуманітарных ведах". г.Брэст, 1993. С. - 99 – 100.
17 Правілы жыцця для моладзі стараавераў // Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Дыялектыка свядомасці сучаснай моладзі". г.Брэст, 1994. - С. 49.
18 Звычай хаджэння па сонцу ў стараавераў // Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Рэгіянальныя асаблівасці беларуска-пінскага палесся ў мове, фальклоры і літаратуры". г.Брэст, 1994. - С. 117 – 118.
19 Некаторыя асаблівасці староверчаскай абшчыны і сучаснасць // "Технология политики". Міжнародная навуковая канферэнцыя "Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества". Мн., 1995. - С. 297 – 301.
20 Стараверства на Беларусі ў першай палове XIX ст. // Навукова-практычная канферэнцыя "Брестчина, от прошлого к будущему: Наука. Политика. Бизнес. Образование". г.Брэст, 1995. - С. 21 – 22.
21 Перыядычны друк у стараавераў // Міжнародная навуковая канферэнцыя "Брэскай царкоўнай уніі – 400". г.Брэст, 1997. - С. 71 – 74.
22 Единоверие и судьба русского этноса на Белорусии // Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблема развіцця заходняга рэгіёна Беларусі". г.Брэст, 1998. - Ч. 1. - С. 87 – 92.
23 Природа свадебных обрядов старообрядцев на Белоруси в конце XIX – начале XX вв. // Материалы Республиканской научно-практической конференции "Мировоззрение и наука на рубеже третьего тысячелетия".(17 –18 ноября 1998 г.) г.Брест, 1999. - С. 211 – 213.

РЭЗЮМЭ

Гарбацкі Андрэй Аляксандравіч, "Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.ст."

Аб'ект і прадмет даследавання: аб'ектам даследавання з'яўляюцца архіўныя дакументы і этнаграфічныя матэрыялы, якія датычаць жыцця стараабраднікаў на беларускіх землях. Прадметам даследавання з'яўляецца важны гістарычны працэс: перасяленне ў межы Рэчы Паспалітай, а канкрэтна на беларускія землі, вялікай колькасці рускіх стараабраднікаў і жыццё іх на Беларусі.

Мэта работы: мэта работы заключаецца ў тым, каб паказаць прычыны перасялення рускіх стараабраднікаў на землі Рэчы Паспалітай, а таксама спецыфіку сацыянай арыентацыі, сацыяльна-эканамічных, культурна-духоўных адносін і маральных установак стараабрадніцкіх сагласаў і толкаў на беларускіх землях.

Метадалогія і метады даследавання: асноўным метадам праведзенага даследавання з'яўлецца гісторыка-абагульняльны метад: аналіз і абагульненне архіўных матэрыялаў, стараабрадніцкіх рукапісаў і гістарычных даследаванняў. Выкарыстоўваліся таксама гісторыка-сістэмны, гісторыка-генетычны і гісторыка-тыпалагічны метады.

Сацыяльна-эканамічнае і ўнутрыпалітычнае становішча Рускай дзяржавы прымушала стараабраднікаў мігрыраваць і за мяжу. Апынуліся стараабраднікі на беларускіх землях, якія ў той час уваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай. Талерантнасць у адносінах да стараабраднікаў была характэрнай для ўлад Рэчы Паспалітай. Рускія перасяленцы асвойвалі тут неабжытыя землі, стваралі пры гэтым даволі эфектыўную вытворчасць, але сваё жыццё арганізавалі на ўзор жыцця бацькоў і дзядоў. На беларускіх землях рускія стараабраднікі пабудавалі свае першыя манастыры і храмы, якія па хараству і багаццi не ўступалі маскоўскім праваслаўным храмам. Беларуская Ветка на доўгі час стала цэнтрам усіх сагласаў і толкаў папоўства.

Побач з беларускай культурай узнікла культура перасяленцаў з Расіі – стараабраднікаў. Характэрным у гэтай сітуацыі было тое, што беларуская культура і культура рускай дыяспары мірна суіснавалі, аднак не змешваліся. Следы стараабрадніцкай культуры заставаліся ў будаўніцтве манастыроў, цэркваў, малельняў, гаспадарчых пабудоў, у развіцці саматужных промыслаў, ужытковага мастацтва, у сістэме навучання, самабытнай літаратуры і народнай творчасці, у побыце.

Аўтар прыйшоў да высновы, што нельга не адзначыць уклад рускіх стараабраднікаў на беларускіх землях у развіццё вытворчасці, промыслаў, рамесніцтва, будаўніцтва, гандлю, у сельскагаспадарчую вытворчасць. Стараабраднікі на беларускіх землях стварылі адметнае будаўніцтва, промыслы і ўжытковае мастацтва. Бясспрэчную цікавасць уяўляе архітэктурная і мастацкая спадчына стараабраднікаў на беларускіх землях. Абаронцы старога абраду здолелі захаваць сваю адметнасць таксама ў абрадах, кульце і побыце.


## РЕЗЮМЕ

Горбацкий Андрей Александрович, "Старообрядчество на Белоруси в конце XУII – начале XX в.в.".

Объект и предмет исследования: объектом исследования являются архивные документы и этнографические материалы, касающиеся жизни старообрядцев на белорусских землях. Предмет исследования – важный исторический процесс: переселение в пределы Речи Посполитой, а конкретно на белорусские земли, большого количества русских старообрядцев и проживание их на Белоруси.

Цель работы: цель работы состоит в том, чтобы показать причины переселения русских старообрядцев на земли Речи Посполитой, а также специфику социальной ориентации, социально-экономических, культурно-духоъвных отношений и моральных установок старообряднических согласов и толков на белорусских землях.

Методология и методы исследования: основным методом исследования является историко-обощающий метод: анализ и обобщение архивных материалов, старообрядческих рукописей и исторических исследований. Использовались также историко-системный, историко-генетический и историко-типологический методы.

Социально-экономическое и внутриполитическое положение Русского государства заставляло старообрядцев мигрировать за его пределы. Оказались старообрядцы и на белорусских землях, которые в то время входили в состав Речи Посполитой. Толерантность в отношении к старообрядникам была характерной для властей Речи Посполитой. Русские переселенцы осваивали здесь необжитые земли, создавали при этом довольно эффективное производство, однако свою жизнь организовали по образцу жизни своих отцов и дедов. На белорусских землях русские старообрядцы построили свои первые монастыри и храмы, которые по красоте и богатству не уступали московским православным храмам. Белорусская Ветка на долгие годы стала центром всех согласий и толков поповства.

Рядом с белорусской культурой возникла культура переселенцев из России – старообрядцев. Характерным в той ситуации было то, что белорусская культура и культура русской диаспоры мирно сосуществовали, однако не смешивались. Следы старообрядческой культуры оставались в строительстве монастырей, церквей, молелен, хозяйственных





построек, в развитии кустарных промыслов, прикладного искусства, в системе обучения, самобытной литературы и народного творчества, в быту.

Автор пришел к выводу, что нельзя не признать вклад русских старообрядцев на белорусских землях в развитие производства, промыслов, ремесничества, строительства, торговли, в сельскохозяйственное производство. Старообрядцы на белорусских землях создали отличительное строительство, промыслы и прикладное искусство. Бесспорный интерес представляет архитектурное и художественнок наследие старообрядцев на белорусских землях. Защитники старого обряда сумели сохранить свою отличительность также в обрядах, культе и быту.



## SUMMARY

Gorbatski Andrei Alexandrovitch "Old-Faith Belief in Belarus at the end of XУII – the beginning of XX centuries"

Object and subject of research: the object of the research is constituted by archives and ethnographic papers, concerning Old Faith. Believers'life and activities on Belarus Lands. Teh Subject of the research is an important historic process, - namely – migration of great numbers of Russian Old–Faith belierers to (Rzeczpospolita) lands (which later on became Belarus lands) and their life and activities there.

The aim of the research is to show the reasons which led to Russian Old-Faith Believers'migration to (Rzeczpospolita), as well as to clarify peculiarities of their social orientation, of their socio-economical, cultural, spiritual and moral foundations of Old-Faith Belierers' "согласий" and "толков" on Belarus lands.

Methodology and methods of research: the basic method of research is historico-generalizing method which includes the analysis and generalization of the facfs described and mentioned in archives, Old Faith Believers manuscripts and other historic papers. Other methocls such as historic-systemic, historic-genetic and historic-typological ones also have been made use of.

Socio-economic and political situation in Russian state made Old-Faith Believers migrate to regions of (Rzeczpospolita) which later on became Belarus lands. It was typical of Polish authorities to be tolerant to Old-Faith Believers. Russian re-settlers cultivated uninhabited lands, and created an effective agrarian production, but they organized their life the way their fathers and grand fathers used to. On Belarus lands they built their first churches and monasteries which by their beauty and richness were none the worse than Moscow Orthodox Churches. Belarus (Ветка) for many years on became the centre of all "согласий" and "толков" of the clergy.

Side by side with Belarus culture there appeared another culture – that of the re-setllers from Russia – Old-Faith Believers.A peculiar feature of the historic situation was that both Belarus and Russian cultures co – existed peacefully though they nerer mixed. O ne can find traces of Old-Faith Believers'culture in the architecture of monasteries, churches, prayer-houses, household buildings, in the derelopment of crafts, applied arts, in the system of education, in a very original literature, folk-arts, in every-day life.

The author of the reseavch has come to the conclusion that the contribution of Russian Old-Faith Believers, living on Belarus lands, to the development of production, crafts, building, trade, agriculture cannot be overestimated. For Old Faith Believers have managed to build well, to develop crafts and applied arts. Architectoral and artistic heritage of Old-Faith Believers on Belarus lands is of great interest as well. Another distinctive feature is that the defendera of Old-Faith have also managed to preserve their distinctives in tradition, religion aud everyday life.




1999. БрГУ, 2,0 уч.-изд.л., т.100 экз., з. № 438.